ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 238 (3346) Чацьвер, 17 кастрычніка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ТОКІЁ, 16. З Харбіна паведамляюць, што прысуд па справе 38 быў абвешчаны не ў памяшканьні суда, дзе сабраліся родныя падсудных, адвакатура і журналістыя, а ў канторы турмы. Абаронцы падсудных аб гэтым ня былі нават паведамлены. Прыгавор быў выслуханы падсуднымі спакойна.

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

Тав. Домбаль—у Барысаве

БАРЫСАЎ. (Нам кар.). 14-га кастрычніка прыбыў тав. Домбаль, якога на вакзале сустракалі делегацыі барысаўскіх прадпрыемстваў. На станцыі адбыўся шматлюдны мітынг. Тав. Домбаль наведаў гуту, якая носіць яго імя і цікавіўся дасягненьнямі заводу ў сацыялістычным спаборніцтве. Увечары ў горадзе адбыўся ўрачысты сход рабочых, прысьвечаны прыезду т. Домбаля.

Ператорым перазаключэньне калдагавароў у вялікую палітычную кампанію

Скарыстаем гэту кампанію для новага пад'ёму творчай ініцыятывы мас

Выкананьне вытворча-гаспадарчых заданьняў палепшыць эканамічны і культурна-бытавы стан рабочае клясы

ДЫРЭКТЫЎНЫ ЛІСТ ЦСПСБ І ВСНГБ АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ КАЛДАГАВОРНАЙ КАМПАНІІ

УСІМ ПРАФСАЮЗНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ І ГАСПАДАРЧЫМ ОРГАНАМ БССР

ПАВАЖАНЫЯ ТАВАРЫШЫ!

Надыходзячая калдагаворная кампанія будзе працякаць ва ўмовах далейшага росту сацыялістычнага будаўніцтва і шпаркага тэмпу індустрыялізацыі ўсёй народнай гаспадаркі. Мінулы 1928-29 гаспадарчы год, ня гледзячы на труднасьці, што выцякаюць з умоў нашага бурнага гаспадарчага росту ў тэхнічна-адсталай краіне і наперакор працоўтвам права-апартуністычных ухілістых,—даў на асноўных паказальніках ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне плянавых заданьняў. Разам з узмоцненым тэмпам разьвіцьця прамысловасьці і сельскае гаспадаркі адпаведна паляпшаліся матар'яльна-бытавыя ўмовы рабочае клясы. Рост сярэдняй месячнай намінальнай зарплаты па рэспубліканскай прамысловасьці БССР за 1928-29 г. па папярэдніх даных складае—11.6 проц. пры росьце прадукцыйнасьці працы за гэты-ж пэрыяд на 21 проц. (па даных ВСНГБ).

Паляпшэньне жыцьцёвага ўзроўню рабочае клясы толькі па аднэй рэспубліканскай прамысловасьці дало павялічэньне асигнаваньняў па фондзе паляпшэньня быту рабочых да 1.726 тыс. руб. (на 742 тыс. больш мінулага году); на жыльлёва-камунальнае будаўніцтва выдаткавана 3.150 тыс. руб. (на 880 тыс. рубл. больш мінулага году); выдаткі на сацыяльнае страхаваньне па прамысловасьці ВСНГБ (за выключэньнем Белдзяржбуду і лесазагатовак) складаюць 5.100 тыс. (на 1 мільён больш мінулага году). На працягу 1928-29 г. пераведзена на 7-мігадзінны рабочы дзень па Беларусі 5 буйных прадпрыемстваў з колькасьцю рабочых 3.400 чал.

Побач з гэтымі станоўчымі паказальнікамі за мінулы гаспадарчы год ёсьць наступныя недахопы: слабое выкананьне плянавых заданьняў па зьніжэньні сабекошту (за 1928-29 г. сабекошт паніжан на 4.5 проц. супроць прадугледжаных па прам. фін. пляне 7 проц.), не даволі замацавана працоўная дысцыпліна па радзе прадпрыемстваў, слаба яшчэ разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва, ёсьць выпадкі пагоршаньня якасьці выпусканай прадукцыі і інш.

Інтарэсы сапыялістычнага будаўніцтва, абароны краіны і здавальненьне ўсё ўзрастаючых запатрабаваньняў рабочае клясы—патрабуюць яшчэ больш шпаркіх тэмпаў індустрыялізацыі і рэканструкцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі на сапыялістычных падставах. У адпаведнасьці з гэтым на 1929-30 год па кантрольных лічбах прамысловасьці прыняты заданьні, якія значна перавышаюць намечаны тэмп росту прамысловасьці Беларусі на другі год пяцігодкі. Капітальныя затраты на 1929-30 год па прамысловасьні ВСНГБ намячаюцца ў разьмеры 52 мільёнаў руб. (па 5-цігодцы 37.700.000). Рост валавое прадукцыі па кантрольных лічбах прынята ў разьмеры 65 проц. (па пяцігодцы прадугледжана 26,1 проц.). сабекошт прадукцыі павінен быць зьніжаны на 10 проц.

Выходзячы з гэтых задач і кіруючыся дырэктывамі УсеЦСПС і ВСНГ СССР («Труд», № 224 ад 28-IX г. г.), ЦСПСБ і ВСНГБ прапануюць:

I. Асноўныя задачы калдагаворнай кампаніі

Улічваючы недахопы калдагаворнай кампаніі мінулага году, якія выразіліся ў слабым завастрэньні ўвагі рабочых мас на гасп. палітычных задачах рабочае клясы, у сувязі з чым у большасьні выпадкаў кампанія прайшла, як вузка практычная задача і канцэнтравала ўвагу рабочых галоўным чынам навакол матар'яльна-бытавых пытаньняў, ЦСПСБ і ВСНГБ прапануюць усім прафарганізацыям і гаспадарчым органам правесьці калдагаворную кампанію гэтага году, як шырокую гаспадарча-палітычную кампанію. Шырока асьвятляючы перад рабочымі канкрэтныя гаспадарчыя заданьні, што выцякаюць з нашых кантрольных лічбаў, трэба сканцэнтраваць увагу рабочых навакол пытаньняў павышэньня прадукцыйнасьці працы, зьніжэньня сабекошту, паляпшэньня якасьці прадукцыі, зьніжэньня накладных выдаткаў, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, узмацненьня працоўнай дысцыпліны і правядзеньня бесперапыннага вытворчага тыдню.

Побач з узмацненьнем работы прафсаюзаў па абароне матар'яльных, бытавых і культурных патрэб рабочых і служачых, улічаючы і зьвязваючы гэту работу з агульнымі інтарэсамі і задачамі рабочае клясы, уважліва адносячыся да запатрабаваньняў рабочых,—прафсаюзы і гаспадарчыя органы павінны рашуча змагацца з адсталымі і рвацкімі настроямі асобных груп рабочых, даваць рашучы бальшавіцкі адпор вылазкам контр-рэвалюцыйных элементаў, рашткам трацкізму і права-апартуністычным настроям, апіраючыся ў гэтай барацьбе на перадавыя, актыўныя пласты рабочае клясы.

Прафсаюзы і гаспадарчыя органы павінны шырока растлумачыць рабочым масам, што калдагавор ня толькі зьяўляецца формай рэгуляваньня ўмоў працы рабочых, але ён таксама зьяўляецца важным падважнікам выкананьня гаспадарчага пляну і агульным абавязкам, што побач з адказнасьцю гаспадарнікаў за дакладнае выкананьне калдагавору, рабочыя і прафсаюзы з свайго боку бяруць на сябе абавязак выканаць прынятыя заданьні па прам. фін пляне.

II. Праверка выкананьня калдагавароў

У адпаведнасьці з раней данымі дырэктывамі УсеЦСПС і ЦСПСБ прафарганізацыям трэба, побач з правяркай фактычнага выкананьня гаспадарчымі органамі дзейных калдагавароў, праверыць выкананьне ўзятых імі абавязкаў па ахове працы і тэхніцы бясьпечнасьці па дагаворах з органамі НКПрацы. Побач з гэтым праверачныя брыгады (якія павінны быць створаны на падставе пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ ад 17-IX—29 г.) і ФЗМК павінны выкарыстаць матар'ялы праверкі выкананьня гаспадарча-палітычных дагавароў [illegible]

доў на вытворчасьці, што перашкаджаюць разьвіцьцю сац. спаборніцтва, улічваючы ўсё дзеславыя прапановы рабочых.

ВСНГБ абавязвае ўсе трэсты і дырэктароў прадпрыемстваў паставіць свае даклады аб выніках работы прадпрыемстваў і далейшых пэрспэктывах на масавых рабочых сходах, пры гэтым да пастаноўкі гэтых дакладаў гаспадарчыя органы павінны своячасова прадставіць неабходныя матар'ялы ФЗМК.

III. Прадукцыйнасьць працы і зарплата

Рост намінальнай зарплаты на 1929-30 г. вызначаны ў сярэднім па ўсёй распубліканскай прамысловасьці ў разьмеры 8 проц., пры павышэньні прадукцыйнасьці працы на 26,8 проц. Улічваючы існуючы нізкі ўзровень зарплаты на ільна-прадзільнай, шкляной і запалкавай галінах прамысловасьці і значнае адставаньне тэмпу росту іх зарплаты ў параўнаньні з іншымі галінамі, —ВСНГБ па дагаворанасьці з ЦСПСБ адпускае 175 тысяч рублёў (у лік 8 проц.) на мэханічнае падцягваньне зарплаты ў гэтых галінах прамысловасьці з наступнага разьліку: для шкляной прамысловасьці—70.000 руб., для запалкавай 55.000 руб., для ільна-прадзільнай 50.000 руб.

Адпушчаныя сродкі павінны быць скарыстаны за час з 1-га студзеня па 1-е кастрычніка 1930 г. (9 месяцаў).

Скарыстаньне адпушчаных сродкаў на мэханічнае падцягваньне зарплаты па асобных прадпрыемствах павінна праводзіцца па дагаворанасьці паміж трэстамі і адпаведнымі ЦП саюзаў, якія павінны не пазней 25-га кастрычніка разьмеркаваць гэтыя сродкі па асобных прадпрыемствах. Прафсаюзы і гаспадарнікі абавязаны прыняць меры да поўнага выкарыстаньня адпушчаных сум на мэханічнае падцягваньне зарплаты, прычым ні адзін бок ня можа прад'яўляць патрабаваньня аб павялічэньні або памяншэньні ўстаноўленых сум з тым, каб устаноўлены рост намінальнай зарплаты ў 8 проц. ня быў перавышаны. У галінах прамысловасьці, для якіх не адпушчаны сродкі на мэханічнае павышэньне зарплаты, рост яе павінен адбывацца ў разьмерах, прадугледжаным кантрольнымі лічбамі, выключна ў залежнасьці ад павялічэньня інтэнсыўнасьці і падняцьця прадукцыйнасьці працы. Гэта датычыць і ўсіх прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці і працкалектываў. У адносінах працкалектываў, якія ня маюць сваіх прам.-фін. пляну, рэгуляваньне зарплаты праводзіцца па папярэдняй дагаворанасьці паміж аб'яднаньнем працкалектываў з адпаведным праўленьнем саюзу, узгодненым з АПБ (па Менску з ЦСПСБ).

Зарплата кіраўнічага апарату павінна рэгулявацца ў адпаведнасьці з сумамі, прадугледжанымі па кантрольных лічбах.

IV. Рэальная зарплата

Асобная ўвага павінна быць зьвернута з боку прафсаюзных і гаспадарчых органаў на пытаньне павышэньня рэальнай зарплаты. Павінны быць прынятыя рашучыя меры да поўнага ажыцьцяўленьня вызначанага росту рэальнай зарплаты на 1929-30 год у сярэднім у разьмеры 11 проц. Прафсаюзы павінны рашуча дабівацца правільнай пастаноўкі рабочага забесьпячэньня, асабліва с.-г. прадуктамі, аказваючы ўсямернае садзейнічаньне загатоўчым органам у загатоўцы прадуктаў, а таксама наладзіўшы сыстэматычны кантроль усёй рабочай масы і асабліва рабочага актыву за работай спажывецкай каапэрацыі і органаў НК Гандлю.

V. Пытаньні тарыфнай рэформы

У надыходзячую калдагаворную кампанію поўнасьцю павінна быць скончана правядзеньне тарыфнай рэформы ў тых галінах прамысловасьці, дзе яна праводзілася ў папярэднія гады, але не закончана. У галінах прамысловасьці, для якіх устаноўлен фонд мэханічнага павышэньня зарплаты, частка сродкаў можа быць скарыстана для канчатковага правядзеньня тарыфнай рэформы. Па іншых галінах прамысловасьці тарыфная рэформа можа быць праведзена шляхам выкарыстаньня часткі эканоміі па зарплаце, што атрымліваецца ў сувязі з перагледам норм і распэнак з такім разьлікам, каб рост зарплаты адпавядаў кантрольным лічбам. У адносінах адміністрацыйна-тэхнічага пэрсаналу, тарыфная рэформа павінна праводзіцца ў рамках фонду зарплаты гэтай групы работнікаў, улічваючы пры гэтым усе віды аплаты, як: прэміяльныя, акордныя аплаты і г. д., не дапускаючы выдаткаваньня для гэтай мэты сродкаў з фонду мэханічнага павышэньня зарплаты.

Неабходна таксама вынішчыць устаноўленую па многіх кал. дагаворах аплату начасоўшчыкаў па сярэднім прыробтку зьдзельшчыкаў на такіх работах, якія ня маюць простага ўплыву на павялічэньне прадукцыйнасьці працы зьдзельшчыкаў, устанавіўшы для іх цьвёрдую аплату па іх кваліфікацыі.

VI. Нармаваньне працы

На пастаноўку нармаваньня працы на прадпрыемствах да сучаснага моманту, як з боку гаспадарчых органаў, так і праф. арганізацый была зьвернута ўсім слабая ўвага, у сувязі з чым у гэтай працы ёсьць значныя недахопы.

ВСНГБ і ЦСПСБ прапануе гаспадарчым і праф. органам прыняць рашучыя меры да ўзмацненьня работы ТНБ на прадпрыемствах і ўсямернага разгортваньня работы па тэхнічным нармаваньні. Перагляд і праверка норм выпрацоўкі павінны праводзіцца сыстэматычна на працягу ўсяго году, не выключаючы і пэрыяд калдагаворнай кампаніі. Прафэсыянальным і гаспадарчым органам неабходна распрацаваць падрабязны плян і паралак перагляду норм выпрацоўкі па цэхах і асобных групах рабочых, заключаючы для гэтага асобную згоду. Пры перагледзе норм выпрацыйнасьці працы і зарплаты ў разьмеры, прадугледжаным па кантрольных лічбах, аб чым неабходна ўключыць спэцыяльныя пункты ў калдагавары. Устанаўленьне новых норм і расцэнак павінна праводзіцца на падставе навукова ўгрунтаваных даных, а таксама на падставе вопытных статыстычных даных, калі апошнімі выяўляюцца значныя перапрацоўкі. Прадугледжаныя нормы выпрацоўкі і зьдзельныя расцэнкі выпрацоўваюцца на ўвесь год, датэрміновы перагляд норм павінен быць утворены ў выпадках правядзеньня арганізацыйных і тэхнічных паляпшэньняў, якія маюць уплыў на рост выпрацоўкі рабочых, а таксама ў выпадках устанаўленьня тэхнічным нармаваньнем няправільнасьці існуючых норм.

Улічваючы важнасьць работы па тэхнічным нармаваньні, ад чаго ў значнай ступені залежыць правільнасьць арганізацыі працы і паляпшэньня работы прадпрыемства, — ЦСПСБ і ВСНГБ прапануюць усім праф. і гасп. арганізацыям паставіць работу ТНБ у цэнтры сваёй увагі, узмацняючы такавыя належным кадрам нармоўшчыкаў.

VII. Праца жанчын і падросткаў

У мэтах паляпшэньня матар'яльнага і культурнага ўзроўню работніц у надыходзячай калдагаворнай кампаніі, трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на павышэньне вытворчай кваліфікацыі работніц, сваячасовае і больш гібкае перасоўваньне іх на вышэйшую кваліфікацыю і абслугоўваньне работніц бытавымі ўстановамі.

Улічваючы, што на радзе галін вытворчасьці адзначаецца памяншэньне ўдзельнай вагі жаночае працы, а ў некаторых прадпрыемствах яўнае ці захаванае выцясьненьне жаночае працы, — у надыходзячую калдагаворную кампанію павінна быць завострана ўвага на большым укараненьні жаночае працы ў вытворчасьць.

Побач з правядзеньнем лініі па ўцягненьні жанчын - адзіночак у вытворчасьць, неабходна таксама ўзяць курс на ўцягненьне ў вытворчасьць жонак рабочых, якія знаходзяцца на вучоце біржы працы.

У галіне рэгуляваньня працы вучняў і падросткаў, неабходна кіравацца наступным:

а) У тых галінах прамысловасьці, дзе вызначана мэханічнае павышэньне зарплаты, павінна быць таксама прадугледжана падцягваньне зарплаты вучняў, у разьмерах, устаноўленых адпаведнымі саюзамі і гасп. органамі пры ўдзеле прадстаўнікоў ЛКСМБ.

б) Своячасова пераводзіць вучняў з разраду ў разрад, а ў адносінах вучняў апошняга году навучаньня—даць ім магчымасьць выкананьня зьдзельных работ на роўных падставах з дарослымі рабочымі з даплатай за скарочаны рабочы дзень паміж асноўнай стаўкай, праводзячы гэтыя мерапрыемствы больш рашуча ў адносінах падросткаў-дзяўчат.

в) Неабходна прадугледзець у перазаключаемых калдагаворах пытаньні аховы працы, культурна-бытавыя ўмовы вучняў - падросткаў, а таксама і прыём на работу перапросткаў і дзяцей рабочых, якія знаходзяцца на вучоце біржы працы нараўні з дарослымі рабочымі — членамі саюзу.

ЦСПСБ і ВСНГБ завастраюць увагу праф. і гасп. арганізацый па неабходнасьці больш рашучага ўкараненьня працы падросткаў - дзяўчат у вытворчасьці. У сувязі з неабходнасьцю давядзеньня ўдзельнае вагі падросткаў-дзяўчат у вытворчасьці да 50 проц. у адносінах да агульнай колькасьці падросткаў, — цэнтральным праўленьням саюзаў разам з адпаведнымі трэстамі неабходна вызначыць канкрэтныя прадпрыемствы, дзе гэткія павінны быць павялічаны.

г) Максымум увагі павінен быць зьвернуты на пытаньні лепшай пастаноўкі навучаньня падросткаў, як індывідуальна - брыгадным вучнёўствам, так і школамі ФЗВ.

VIII. Праца і зарплата спэцыялістых

Рэгуляваньне працы і зарплаты спэцыялістых у тых саюзах, дзе праведзена тарыфная рэформа, павінна праводзіцца на падставе тарыфных сетак і паразрадная разьбіўцы, прадугледжанай тарыфнымі даведачнікамі адпаведных саюзаў. Неабходна ў калдагаворах унесьці спэцыяльны разьдзел аб умовах працы і зарплаты спэцыялістых, пры гэтым спэцыялістыя павінны быць у максымальнай меры ўцягнуты ў абгаварэньне ня толькі разьдзелу калдагавору аб спэцыялістых, але і ўсяго дагавору цалкам. Выпадкі самавольнага ўстанаўленьня разьмераў зарплаты асобным спэцыялістым гаспадарнікамі павінны быць катэгарычна зьнішчаны. У выпадках неабходнасьці запрашэньня высока - кваліфікаваных спэцыялістых з больш павялічанымі акладамі, гас. органы павінны да пастаноўкі гэтых пытаньняў на зацьвярджэньне органаў НКПрацы — узгадняць іх з адпаведнымі прафсаюзамі. Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільнае правядзеньне прэміяваньня тэхнічнага пэрсаналу з тым, каб гэткае праводзілася за сапраўдныя дасягненьні, якія даюць эканамічны эфэкт. Побач з гэтым неабходна рашуча ліквідаваць такія формы прэміяваньня, якія носяць характар захаванай формы зарплаты.

IX. Праўныя і бытавыя ўмовы

У праўнай і бытавой частцы калдагавору неабходна захаваць існуючыя нормы, уносячы адпаведныя ўдасканаленьні на падставе існуючых зьмен у працоўнае законадаўства (чарговыя адпускі і г. д.). Гэта, аднак, не павінна прывесьці да пагоршаньня забесьпячэньня рабочых і служачых спэц. вопраткай.

Разьмер адлічэньняў на ўтрыманьне нізавых прафесыянальных ячэек і культурна - бытавых устаноў, павінен быць таксама захаваны ў разьмеры мінулага году. Па новых дагаворах неабходна прадугледзець умовы працы, тэрміны пераводу і парадак работы прадпрыемстваў, у якіх уводзіцца бесьперапынны вытворчы тыдзень, побач з гэтым неабходна прыстасаваць абслугоўваньне гэтых рабочых і работніц адпаведнымі культурна-бытавымі ўстановамі (чырв. куткі, ясьлі, дзіцячыя пляцоўкі, ачагі, сталовыя, мэд. пункты і г. д.).

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на пытаньні аховы працы, тэхнікі бясьпечнасьці і жыльлёва-камунальнага будаўніцтва. У дагаворах неабходна прадугледзець, па якіх прадпрыемствах праводзяцца тыя ці іншыя мерапрыемствы і ў якія тэрміны павінны быць праведзены мерапрыемствы па тэхніцы бясьпечнасьці і ахове працы, згодна прам.-фін. пляну.

Побач з гэтым неабходна прадугледзець, па якіх прадпрыемствах, у якім разьмеры павінна быць разгорнута жыльлёвае будаўніцтва і на якіх прадпрыемствах павінны быць абсталяваны ясьлі, чырв. куткі, сталовыя, памяшканьні для прыёму харчу, дожджыкі, лазьні і г. д. З прычыны існуючых выпадкаў нескарыстаньня сродкаў лек. фонду, што адпускаюцца на арганізацыю мэдычных пунктаў на прадпрыемствах у сувязі з адсутнасьцю памяшканьняў для гэтых пунктаў, неабходна прадугледзець па кал. дагаварох абавязковае прадастаўленьне гаспадарчымі органамі неабходных памяшканьняў.

X. Арганізацыйныя пытаньні

Не пазьней 1-га лістапада павінна быць скончана работа вылучаных брыгад па праверцы выкананьня дзейных дагавароў і прыступлена да абгаварэньня вынікаў праверкі і складаньня новых дагавароў. На працягу лістапада месяца павінна быць праведзена абмеркаваньне праектаў новых дагавароў.

Не пазьней 20-га сьнежня калдагавары павінны быць падпісаны бакамі і зарэгістраваны ў органах НКПрацы з тым, каб у апошніх лічбах сьнежня месяца новыя калдагавары былі вывешаны ў прадпрыемствах. Неабходна дабіцца максымальнага паляпшэньня пастаноўкі абгаварэньня дагавароў на цэхах, вьмерах і па агульна-заводзкіх сходах і канфэрэнцыях, уцягваючы галоўна ўсіх рабочых у абгаварэньне праектаў дагавароў. Выпадкі габінэтнага заключэньня дагавароў без адпаведнага ўдзелу ў гэтай працы рабочых мас, павінны быць катэгарычна зьнішчаны.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на пытаньні правільных і выразных фармулёвак асобных пунктаў калдагавароў, улічваючы, што на глебе няправільных фармулёвак стварацца зусім непатрэбныя канфлікты.

Пры абгаварэньні дагавароў на масавых сходах, гаспадарнікі павінны прымаць актыўны ўдзел у гэтай працы, асьвятляючы перад рабочымі вынікі работы прадпрыемства за 1928-29 г. і вытворча-фінансавыя пляны на 1929-30 год. У выпадках высоўваньня асобнымі рабочымі непасільных запатрабаваньняў, гас. органы пры поўным падтрыманьні праф. арганізацый, павінны растлумачыць рабочым, што гэтыя запатрабаваньні зьяўляюцца неажыцьцёўнымі. ЦСПСБ і ВСНГБ прапануюць праф. і гас. органам канчаткова зьнішчыць меўшыя месца ў мінулым годзе бюракратычныя скажэньні гасп. і праф. органамі на мясцох дырэктыў вышэйшых органаў, што прывяло да шматлікіх канфліктаў па дробных пытаньнях і ўтварала недапушчальную цяганіну. Вырашэньне спрэчных пытаньняў у парадку пагаджальна - трацэйскага разбору можа і павінна мець месца толькі ў выключных выпадках пасьля таго, калі былі выкарыстаны ўсе спосабы ўрэгуляваньня гэтых спрэчных пытаньняў у парадку дагаворанасьці бакоў.

Надаючы кампаніі па перазаключэньні калдагавароў вялізнае палітычнае і эканамічнае значэньне, прафсаюзы і гасп. органы павінны прылажыць максымум увагі, энэргіі і ініцыятывы да правільнага і своячасовага правядзеньня гэтай работы.

Нам. старшыні ЦСПСБ РОЗІН.
Нам. старшыні ВСНГБ БАЛЬ.

АЎСТРЫЙСКІ ФАШЫСЦКІ ЎРАД ЗА ПРАЦАЮ

Законапраекты зьмены канстытуцыі

ВЕНА, 13. Нацыянальная рада (парлямант) адкрываецца 16-га кастрычніка. Ужо на першых пасяджэньнях будуць унесены законапраекты, якія ў сэнсе зьмены канстытуцыі ідуць насустрэч пажаданьням хэймвэру яшчэ далей, чым праекты ранейшага прэм'ера Штрэрувіца. Мяркуецца пашырэньне поўнамоцтваў прэзыдэнта, якому будзе надана права назначаць і зьмяшчаць урад, распускаць парлямант, кіраваць краем без парляманту і абвяшчаць стан аблогі. Саюзная рада (выбарны дарадчы орган) будзе пашыраны. Вена ўжо ня будзе правінцыяй і, як сталіца, будзе падпарадкавана непасрэдна цэнтральнаму ўраду. Камунальная паліцыя стане агульнадзяржаўнай. Салдаты і дзяржаўныя служачыя і чыгуначнікі пазбаўляюцца права абіраць даверанных асоб. Выбарчы ўзрост павялічваецца з 21 году да 24. Акрамя таго будзе праведзены так званы закон супроць тэрору (гэты закон павінен перашкодзіць рабочым ужываць меры супроць штрэйкбрэхераў), а таксама адбудзецца рэформа судаводзтва і закону аб друку. Афіцыйна паведамляецца, што прэм'ер Шобэр вёў перагаворы з лідэрамі сацыял-дэмакратычнай партыі Зэйцам і Данабэргам.

Мэты ўраду і хэймвэру адноль каквыя

ВЕНА, 15. Дэбаты аб рэформе канстытуцыі, якія павінны адбыцца ў парляманце, паслужылі тэмаю для новых выступленьняў лідэраў ляндбунду (кулацкая партыя) і хрысьціянска-сацыяльнае партыі (клерыкалы). Лева-буржуазны і сацыял-дэмакратычны друк бачаць у гэтых выступленьнях новую пагрозу фашысцкага перавароту, калі сацыял-дэмакраты не капітулююць цалкам. Лідэр ляндбунду, міністар унутраных спраў, заявіў на сходзе сваіх аднадумцаў у Кляэнфурце, што сацыял-дэмакратам «прыходзіцца рабіць выбар паміж мірам і вайной, дэмакратыяй і дыктатурай». Віцэ-прэм'ер і вайсковы міністар Вогуен заявіў на сходзе хрысьціянска-сацыяльнай партыі ў Вене, што мэты хэймвэру і ўраду адноль каквы і што ўрад цьвёрда разьлічвае на [illegible] друк становіцца ў апазыцыю толькі ў адносінах да самага другараднага з законапраектаў—да таго, які пазбаўляе Вену праў самастойнай правінцыі.

Сацыял-здраднікі „дагаварыліся"

ВЕНА, 14. Мяркуючы на апошніх вестках з Будапэшту (Вэнгрыя), паміж сацыял-дэмакратамі і Бэтленам вызначылася некаторае зьбліжэньне. Бэтлен пайшоў на дробныя ўступкі сацыял-дэмакратам, каб ізаляваць буржуазную апазыцыю і прыцягнуць сацыял-дэмакратаў на бок ураду ў такім пытаньні, як перагляд Трыянонскага дагавору. Уступкі ўраду сацыял-дэмакратам зводзяцца да частковай амністыі. Афіцыйна паведамляецца, што, паводле прапановы Бэтлена, кіраўнік дзяржавы Хорці загадаў спыніць справу супроць сацыял-дэмакратычных лідэраў Гаранді, Бухінгэра, якія жывуць у Вене ў эміграцыі. Сацыял-дэмакратычная «Нэнсава» стараецца намаляваць амніставаньне Гаранді і Бухінгэра, як першы крок па шляху дэмакратызацыі Вэнгрыі.

Разгон шматтысячнае дэманстрацыі рабочых

ВЕНА, 14. У Будапэшце (Вэнгрыя) 13-га адбыўся масавы сход, скліканы сацыял-дэмакратамі. Лідэры сацыял-дэмакратаў выступалі з пратэстамі супроць некаторых мерапрыемстваў ураду, з наяўнаю мэтаю адцягнуць увагу працоўных ад уступак ураду, якія зроблены ў апошнія дні сацыял-дэмакратычнай партыяй.

Пасьля сходу звыш 10 тыс. рабочых, ня гледзячы на загад паліцыі разыйсьціся, арганізавалі дэманстрацыю, якая прайшла па галоўных вуліцах гораду. Чутны былі воклічы: «Прэч фашызм!» «Прэч згоду сацыял-дэмакратаў з урадам!», «Прэч узбраеньні!». У цэнтры гораду дэманстранты натыкнуліся на вялікі атрад конной паліцыі, якая атакавала дэманстрацыю. Дэманстрацыя была разагнана. Некалькі рабочых паранены. Зроблены рад арыштаў. Пасьля разгону дэманстрацыі, рабо[illegible]

Антысэміцкія дэманстрацыі фашысцкага студэнцтва ў Будапэшце

ВЕНА, 10. Як падаюць з Будапэшту, апошнімі днямі па ўсіх факультэтах будапэшцкага унівэрсытэту адбываліся антысэміцкія дэманстрацыі фашысцкага студэнцтва. Дэманстрацыі працягваліся і сёньня. Некалькі студэнтаў-яўрэяў былі зьбіты і паранены. Апазыцыйны друк мяркуе, што гэтыя выступленьні інсцэнізаваны рэакцыйнымі партыямі, каб адцягнуць увагу грамадзкае думкі ад унутры-палітычных і эканамічных затрудненьняў ураду.

Прадвыбарная кампанія ў Чэхіі

Сацыял-здраднікі і ўрад „дзейнічаюць" супроць камуністых

ПРАГА, 15. Цэнтральная выбарчая камісія зацьвердзіла 19 кандыдацкіх сьпісаў у палату дэпутатаў і 16 сьпісаў у сэнат, у зьвязку з выбарамі, якія павінны адбыцца 27-га кастрычніка. Пры жараб'ёўцы сьпіс кампартыі атрымаў першы нумар. З выстаўленых на першых мясцох 80 кандыдатаў—55 рабочых ад варштату, 17 бяднейшых сялян, 12 партыйных работнікаў, з якіх палова—былыя рабочыя. Міжпартыйная барацьба ў кааліцыйным лягеры ў поўным разгары. У брудной кампаніі, якую ўзьнялі сацыял-дэмакраты супроць кампартыі, яны дамагаліча скарыстоўваюць злачынную авантуру Бесядоўскага. Камуністыя разгортваюць прадвыбарчую агітацыю пад лёзунгам «кляса супроць клясы». Пры гэтым кампартыя непасрэдна зьвязвае сваю выбарчую кампанію з падрыстоўкай да сьвяткаваньня 12-е гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. [illegible]

Тав. ГАМАРНІК—член РВС СССР

Саюзны Саўнарком назначыў т. ГАМАРНІКА Яна Барысавіча членам Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету Саюзу ССР.

Генэральская вайна ў Кітаі

Сун Лян-чэн разьбіў нанкінскае войска ў Хэнані

ТОКІЁ, 15. «Ніці Ніці» падае, што Сун Лян-чэн разьбіў нанкінскае войска ў Хэнані і заняў Лаян. (ТАСС).

Нанкінскае войска згуртоўваецца каля Хубэя

ШАНХАЙ, 16. Паводле паведамленьня агенцтва «Рэйтэр» войска Гомінцаюня наступае трымя калёнамі ўздоўж Лунхайскай і Пэйпін-Ханькоўскай чыгунак. Часьці Сун Лян-чэна мінулі ўжо Лёян. Нанкінскія войскі працягваюць адыходзіць на ўсход. Нанкін згуртоўвае вайска на поўначы Хубэя. У Ханькоў пасьляхова пасланы самалёты і бранявікі.

Чжан Сюэ-лян захоўвае нэйтралітэт

ШАНХАЙ, 16. У кітайскім друку Пэйпіна апублікавана інтэрв'ю Чжан Сюэляна, у якім заяўляе, што ён захавае нэйтралітэт у барацьбе паміж Гомінцаюнам і Нанкінам. Чжан Сюэ-лян разам з гэтым адзначае, што центральны ўрад «не павінен быць урадам аднаго чалавека».

Войскі Фынь Юй-сяна выступілі з Нанчу

ПЭЙПІН, 18. «Говень» паведамляе, што часьці войск Фынь Юй-сяна пад камандаю генэрала Пуи Пін-сіна выступалі з Нанчу на паўднёвы ўсход з наяўным намерам перасекчы Пэйпін-Ханькоўскую чыгунку. (ТАСС).

Чэн Цян-юан стаў на бок Нанкіна

ШАНХАЙ, 16. Нанкінскае агенцтва «Го-Мінь» працягвае сьцьвярджаць, што на поўдні складаецца наспрыяльнае становішча для Нанкіна. Агенцтва «Сін Бун-Рэнго» паведамляе, што старшыня шаньдуньскага ўраду Чэн Цян-юан, які першапачаткова рашыў падтрымаць выступленьне Фынь Юй-сяна, перадумаў і абвясьціў сябе прыхільнікам Нанкіну. (ТАСС).

„Прысуд" па справе 37 савецкіх грамадзян

ТОКІЁ, 13. Агенцтва «Сін-Бун-Рэнго» паведамляе: «Сёньня ў Харбіне абвешчаны прысуд па справе 37 савецкіх грамадзян і аднаго кітайца, арыштаваных 12-га мая ў савецкім консульстве. Усе падсудныя акрамя кітайца прызнаны вінаватымі. 5 чал. прысуджаны да 9 год турэмнага зьняволеньня кожны, 21—да 7 год, 7—да 5 год і 4 грамадзянкі—да 4 год. Кітаец апраўданы».

Пратэст савецкага ўраду супроць выдачы дзяржаўных грошай белагвардзейцу

ТОКІЁ, 15. Японскі друк паведамляе, што савецкі ўрад перадаў японскаму паслу ў Маскве Танака пратэст супроць выдачы грошай белагвардзейцу Падцяціну. (ТАСС).

У 1919 годзе Калчак напярэдадні свайго разгрому адправіў ўва Ўладывасток 2 вагоны золата ў зьлітках з захопленага ім залатога фонду. Гэтыя вагоны ў Чыце перахапіў вядомы бандыт Сяменаў. У далейшым частку гэтага золата Сяменаў пераправіў у Японію і перадаў Падцяціну, б. царскаму вайсковаму агенту, для закупкі зброі і вайсковай амуніцыі для белагвардзейскіх банд, якія арудвалі на Далёкім Усходзе пад камандаю Сяменава. Падцяціну, аднак, уважаў за лепшае палажыць гэтыя грошы ў суме 1.400 тысяч іен у японскі банк на асабісты рахунак. Пасьля разгрому інтэрвэнцыі пэны белагвардзейскіх прахадзімцаў і арганізацый, пачынаючы ад Сяменава, спрачаліся ў шматлікіх японскіх судовых інстанцыях за гэтыя сумы.

Прадстаўнік Падцяціна на судзе пярэчыў пратэзіям Сяменава і іншых заявіўшы, што гэтыя сумы зьяўляюцца дзяржаўнымі, а не асабістай уласнасьцю. У адным з рашэньняў суда па справе было канстатавана, што грошы не зьяўляюцца прыватнай уласнасьцю. Такім чынам не магло быць сумненьняў адносна таго, што гэтыя грошы належаць СССР. Ня гледзячы на гэта, Японскі ўрад выдаў белагвардзейцу Падцяціну названую суму.

Выступленьне шведзкіх апартуністых супроць ВКП

Здраднік Чыльбум дзейначае разам з паліцыяй...

СТАКГОЛЬМ, 16. 9-га кастрычніка адбылося сумеснае пасяджэньне палітбюро шведзкай кампартыі з дэлегацыяй ВКП. З прычыны адмовы апартуністычнай групы Чыльбума падпарадкавацца дырэктывам ВКП аб скліканьні зьезду ў студзені, дэлегацыя ВКП заявіла аб адхіленьні ад працы да зьезду Чыльбума і ўсіх яго прыхільнікаў. Група Чыльбума заявіла, што яна не падпарадкуецца рашэньню ВКП. Тады прыхільнікі Камінтэрну заявілі аб спыненьні сумеснага пасяджэньня з групай Чыльбума.

Пасьля пасяджэньня левая апазыцыя і камсамол занялі памяшканьне

Перадавых рабочых—у КП(б)Б

Дырэктывы аб узмацненьні росту выконваюцца слаба

Штодзенна і сыстэматычна ўцягваць у партыю лепшых рабочых і работніц, батракоў і с.-г. рабочых

Па СССР

Склад калегіі НКА РСФСР

МАСКВА. ОНК СССР зацьверджаў намесьнікамі наркома асьветы т. т. Панкроўскага (першым намесьнікам), Крупскую (Ульянаву), Эпштэйна і Курса В. А. Членамі калегіі Наркамасьветы зацьверджаны наступныя т. т.: Вышынскі А. Я., Халатаў, Папоў, Разінбаеў, Гольшаў, Шохін А. Д., Шацкі, Шульгін З. Н., Раскольнікаў Ф. Ф., Алексінскі А. М., Лупал, акадэмік Архангельскі А. Д. і праф. Брыкэ Э. З.

Адкрыцьце рабоча-селянскага унівэрсытэту па радыё

МАСКВА, 15. 15-га кастрычніка ў радыё-тэатры «НКПИТ» адбылося ўрачыстае адкрыцьце рабоча-селянскага унівэрсытэту па радыё. Пасяджэньне транслявана ўсімі радыё-станцыямі СССР. Тав. Яраслаўскі перадаў ўсім радыя-слухачом «бязбожнае» прывітаньне ад ЦС саюзу ваяўнічых бязбожнікаў. Ва унівэрсытэт ужо залічана 2 200 чалавек. (ТАСС).

Забастоўка батракоў канцэсіі „Галяндыя-Украіна"

МЭЛІТОПАЛЬ, 16. Батракі канцэсіі «Галяндыя-Украіны» ў Мялешанскім раёне абвясьцілі забастоўку. Бастуючыя патрабуюць выплаты зьвышэрміновых за ўвесь час сваёй работы у канцэсыянэраў і паляшчэньня харчаваньня.

Створан забастовачны камітэт, выдадзены 2 нумары насьцегазэты, прысьвечаныя забастоўцы. Акрыпрафсавет асыгнаваў на дапамогу бастуючым 300 рублёў. Рабочыя мэлітопальскіх прадпрыемстваў адлічаюць на карысьць батракоў 1 проц. заработку (ТАСС)

3.000 тон зярна дзяржаве

АРМАВІР, 16. Першы дзень прызыву. Новабранцы арганізавалі хлебны абоз і здалі дзяржаве 3 тысячы тон зярна. Некаторыя сёлы арганізавалі хлебныя абозы ў сувязі з прыездам у Армавірскую акругу дэлегацыі Бійскае акругі, якая ўступіла з Армавірскай у спаборніцтва.

Астраханскі працэс

Да вышэйшае меры пакаранньня за шкодніцтва

АСТРАХАНЬ, 16. Закончылися прамовы дзяржаўных абвінаваўцаў. Абвінаваўцы ў сваіх прамовах падрабязна ахарактарызавалі шкодную дзейнасьць прыватнага сэктару і яго лёкаяў—апаратаў гандлёвага аддзелу, фінаддзелу і цэрабкопу. Прыватнікі былі недаабкладзены на 5 з лішнім мільёнаў рублёў. Нядоімкі складаюць звыш 3 мільёнаў рублёў. Устаноўлена, што прыватнік «купіў фінаддзел» за 30.00 руб. хабараў. У выніку гэтае «куплі» ў кішэні прыватніка засталося 12 мільёнаў рублёў. «Усе злоўжываньні, якія зрабілі падсудныя —гаворыць абвінаваўцы,—можна кваліфікаваць толькі па 58 арт., як ня ўлае шкодніцтва сацыялістычнаму будаўніцтву». Абвінаваўцы патрабуюць вышэйшай меры сацыяльнай абароны для 21 падсуднага.

Да зьезду ўсянямецкага кангрэсу рэвалюцыйнае апозыцыі прафсаюзаў

МАСКВА, 16. 30-га лістапада склікаецца ўсенямецкі кангрэс рэвалюцыйнай апозыцыі прафсаюзаў. Выканбюро Прафінтэрну лічыць неабходным унесьці ў парадак дня гэтага кангрэсу наступныя пытаньні: аб выніках эканамічных баёў у Нямеччыне, аб практыцы работы рэвалюцыйных фабзаўкомаў, аб недахопах у працы рэвалюцыйнага прафруху і аб выніках удзелу рэвалюцыйных прафсаюзаў у кампаніях 1-га мая і 1-га жніўня. На кангрэсе будзе пастаўлена таксама пытаньне аб падрыхтоўцы да 5-га кангрэсу Прафінтэрну.

РЭЗАЛЮЦЫІ І САПРАЎДНАСЬЦЬ

(Быхаўская арганізацыя КП(б)Б, Магілеўшчына)

Наша раённая партарганізацыя, бадай, зусім не вярбуе ў КП(б)Б рабочых ад варштату, батракоў і с.-г. рабочых.

У раёне ёсьць пэўныя кадры для росту арганізацыі. На заводзе «Ільліч» працуе звыш 500 рабочых і работніц. На прадпрыемствах мясцовае прамысловасьці таксама працуе некалькі сотень рабочых. Акрамя гэтага ў раёне ёсьць звыш тысячы батракоў і с.-г. рабочых.

Сярод гэтых вялікіх пралетарскіх кадраў ёсьць шмат перадавых рабочых і батракоў, якія адданы партыі і шчыра жадаюць браць удзел у нашым будаўніцтве.

Партыйныя ячэйкі на чале з раённым камітэтам партыі пры жаданьні маглі-б разгарнуць вялікую работу на вярбоўцы ў партыю рабочых, работніц і батракоў.

На жаль гэта работа праводзіцца толькі ў... рэзалюцыях. Раённы камітэт і ячэйкі ўхваляюць прыгожыя рэзалюцыі аб неабходнасьці ўзмацніць тэмп вярбоўкі рабочых ад варштату, а на справе нічога ня робяць па ўцягненьні ў КП(б)Б пралетарскіх кадраў. Культурна - выхаваўчая і масавая работа заняпала. Ячэйкі не праводзяць ніякай палітычнай работы сярод рабочых і батракоў. На прадпрыемствах заняпала індывідуальная і групавая агітацыя. Камуністыя не растлумачваюць рабочым і работніцам важнейшых гаспадарча - палітычных пытаньняў і ня ўцягваюць іх у сацыялістычнае спаборніцтва. Уся масавая работа посіць шаблённы і трафарэтны характар. У выніку арганізацыя амаль зусім не расьце. За год у партыю прыняты ўсяго 4 рабочыя. Партыйная праслойка на заводзе «Ільліч» зьмейшылася з 12 проц. да 10. Заводзкая партарганізацыя бязьдзейнічае і зусім не вярбуе ў свае рады старых рабочых і работніц. Рост за лік батрацтва адсутнічае. Партыйныя ячэйкі праяўляюць у гэтым пытаньні чыноўніцкі кансэрватызм. Работа сярод батрацтва праводзіцца марудна і дрэнна. Ня дзіва, што за цэлы год арганізацыя ўцягнула ў партыю толькі двух батракоў. Раённы камітэт літаральна нічога ня робіць, каб дабіцца рашучага пералому ў вярбоўцы рабочых і батракоў. Раённы камітэт і ячэйкі толькі выносяць рэзалюцыі і пастановы.

І таму ня дзіўна, што зьмест рэзалюцый **Быхаўскага** раённага камітэту рэзка разыходзіцца з фактамі сапраўднасьці.

ПАВОЛЬНЫМ ТЭМПАМ

(Меншчына)

Да чысткі **Самахвалавіцкая** партарганізацыя не зьвяртала ніякае ўвагі на вярбоўку ў партыю рабочых і батракоў. Саўгаскія і калгаскія ячэйкі ізаляваліся ад мас, і таму масавая палітычная работа сярод беспартыйных рабочых і батракоў, бадай, зусім не праводзілася.

Чыстка ўскалыхнула партыйную арганізацыю і абудзіла актыўнасьць бяднякоў-серадняцкіх мас.

Дзесяткі батракоў і сель.-гас. рабочых падалі заявы аб прыняцьці ў КП(б)Б.

Аднак, ячэйкі не замацавалі дасягнутых вынікаў. Тэмп вярбоўкі пасьля чысткі зьнізіўся. За апошнія тры месяцы арганізацыя прыняла ў партыю толькі 20 чалавек. Сярод прынятых рабочае ядро складае 80 процантаў — 10 с.-г. рабочых, 4 чыгуначнікі і два батракі. Такім чынам, арганізацыя ня выканала дырэктыў чэрвеньскага пленуму Менакруткому аб росьце на 90 проц. за лік рабочых і батракоў.

Многія ячэйкі пасьля чысткі не прынялі ніводнага батрака і с.-г. рабочага. Так, напрыклад, **Караліішчанская, Чырвонапрафінтэрнаўская і Фаніпальская** ячэйкі пасьля чысткі зусім не вярбуюць рабочых і батракоў у рады партыі.

М—ч.

Ад кампаніі да кампаніі

(Парткалектыў заводу «Камунар», Менск)

На заводзе «Камунар» працуе 514 рабочых і работніц. Якасны склад гэтага вялікага рабочага калектыву гаворыць аб нявычэрпных магчымасьцях для росту камуністычнага ядра заводу. Амаль 2/3 рабочых «Камунара» маюць шматгадовы вытворчы стаж (94 рабочыя маюць вытворчы стаж ад 5 да 10 год, 68 рабочых маюць 15 гадовы вытворчы стаж. Каля 100 рабочых працуюць на вытворчасьці па 15-25 і г. д.). Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе. Калі яшчэ дадаць, што многія рабочыя актыўна ўдзельнічаюць у грамадзкім жыцьці заводу і зьяўляюцца лепшымі вытворцамі, дык стане зусім ясна, што імённа ад заводу «Камунар» можна і трэба чакаць вялікіх посьпехаў у галіне выкананьня дырэктыў XII зьезду КП(б)Б аб уцягненьні ў партыю лепшых перадавых рабочых.

Між тым, калектыў заводу налічвае ў сваіх радох усяго 140 камуністых. Тыя лепшыя вытворчыя кадры, якія ёсьць сярод рэшты рабочых, у партыю не завербаваны. Сярод старых вытворцаў і адданых партыі актыўных рабочых калектыў не праводзіць ні індывідуальнай, ні групавой палітычнай апрацоўкі і агітацыі. Наогул бюро партколектыву фармальна адносіцца да вярбоўкі рабочых у партыю. Партыйны калектыў заводу за апошні год ні аднаго разу не абгаворваў пытаньня аб росьце.

Мы не памыліімся, калі назавем рост партыі на заводзе «Камунар» кампанейскім, несыстэматычным, ненармальным.

Факты: за апошнія 9 месяцаў парткалектыў вырас на 20 чалавек. Але 16 чалавек былі прыняты за адзін раз на ўрачыстым сходзе рабочых, прысьвечаным юбілеям заводу і парткалектыву. Толькі за адзін месяц да прыняцьця гэтых таварышоў у партыю, яны былі ўцягнуты ў гурток па ўзьняцьці палітадукацыі. Ці-ж гэта не кампанія, не парадна́сьць? Зразумела, што за адзін месяц таварышы не маглі добра падрыхтавацца да ўступленьня ў рады КП(б)Б. Зусім ня дзіўна, што пры зацьвярджэньні многія рабочыя аказаліся палітычна малапісьменнымі.

Патрэбна сыстэматычная штодзенная работа з беспартыйным актывам, сыстэматычная (невыпадковая, не кампанейская) падрыхтоўка будучых камуністых.

А гэтай работы ня было і няма. Масавая работа на заводзе кульгае. Бюро парткалектыву тлумачыць гэта тым, што рабочыя жывуць далёка ад заводу.

Зьвернемся да камсамольскага калектыву. Што ён робіць для перадачы лепшых камсамольцаў у партыю? Вось лічбы за апошнія 9 месяцаў калектыў ЛКСМБ рэкамандаваў у партыю 7 камсамольцаў, з якіх прыняты толькі 3. Два знаходзяцца яшчэ ў стадыі афармленьня, а два ня прыняты.

Аб чым гавораць гэтыя лічбы? Аб тым, што камсамольскі калектыў вельмі невыстарчальна праводзіць работу па перадачы ў рады КП(б)Б лепшых камсамольцаў. Калектыў ЛКСМБ зусім няўважліва адносіцца да падбору кандыдатур да перадачы іх у партыю.

Вынікі ясныя. Партыйны калектыў заводу павінен дабіцца рашучага пералому ў рабоце па вярбоўцы перадавых рабочых у партыю. Трэба ні на хвіліну не забывацца аб дырэктывах лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і XII-га зьезду КП(б)Б.

С-н.

Аб рэарганізацыі „Известий ЦК ВКП(б)"

(Усім партыйным камітэтам і ячэйкам, усім чытачом часопісі)

Дарагія таварышы!

За апошнія гады наша партыя сыстэматычна накапляла вялікую палітычную і арганізацыйную практыку ў галіне партыйнай і масавай работы. Але на радзе аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын гэта практыка заставалася нараўнальна слаба асьветленай як у нашым агульным друку, так і ў спэцыяльных партыйных часопісях.

У сучасны момант, у сувязі з вялізнымі задачамі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, ускладненьнем і паглыбленьнем усёй партыйнай і масавай работы, пасьпела настойлівая патрэбнасьць у дасканалым вывучэньні і крытычным аналізе практыкі партыйнага будаўніцтва і парткіраўніцтва рознымі галінамі нашай рознастойнай дзейнасьці.

Між, тым, літаратура па пытаньнях партыйнага будаўніцтва надзвычайна мізэрная. Адзіная часопісь, якая ў тэй ці іншай меры гэтыя пытаньні асьвятляе —«Известия ЦК ВКП(б)»,—зьяўляецца яшчэ ў пэўнай ступені бюлетэнем. Ці, перад якім у свой час была пастаўлена вузкая задача: «рэгулярна асьвятляць асноўныя пытаньні бягучай работы ЦК, яго дырэктывы па важнейшых пытаньнях работы партыі і м'тар'ялы аб рабоце мясцовых арганізацый».

За апошні гады «Известия ЦК» выйшлі з рамак інфармацыйнага бюлетэню, асьвятляючы на сваіх старонках, у кіруючых артыкулах і аглядах, розныя праблемы арганізацыйна-партыйнай работы. Але, абярнуўшыся паступова ў цэнтральную партыйную часопісь, «Известия ЦК», зразумела, далёка яшчэ не адпавядаюць задачам вывучэньня партыйнага будаўніцтва ва ўсім абхопе.

Вось чаму паўстала пытаньне аб выданьні спэцыяльнай часопісі, палкам прысьвечанай распрацоўцы праблем партыйнага будаўніцтва і практыкі партыйнай работы. Выходзячы з гэтага, Цэнтральны Камітэт партыі на адным з сваіх апошніх пасяджэньняў прызнаў патрэбным рэарганізаваць «Известия ЦК ВКП(б)» у часопісь, прысьвечаную распрацоўцы праблем партбудаўніцтва і практыкі партработы, даўшы ёй назву «Партийное Строительство».

Такім чынам, у сваім цяперашнім выглядзе часопісь «Известия ЦК ВКП(б)» выходзіць у апошні раз. Замест яе ў бліжэйшы час выйдзе першы нумар часопісі «Партийное Строительство».

Перад новым органам Цэнтральнага Камітэту партыі высоўваюцца наступныя асноўныя задачы:

1) Тэарытычная распрацоўка чарговых праблем партыйнага будаўніцтва.

2) Вывучэньне, аналіз і крытыка практыкі, форм, мэтадаў і сыстэмы работы мясцовых партарганізацый.

3) Пастаноўка на абгаварэньне новых або спрэчных пытаньняў практыкі партбудаўніцтва.

4) Асьвятленьне практыкі партыйнага будаўніцтва мясцовых, асабліва нізавых арганізацый.

5) Інфармаваньне партыі аб рабоце ЦК УсеКП(б) і яго аддзелаў.

6) Выяўленьне ўзорных мерапрыемстваў мясцовых парткомаў.

7) Крытыка і бібліяграфія літаратуры, прысьвечанай пытаньням партбудаўніцтва.

Ясная справа, што выканань гэтыя вялізнай важнасьці задачы часопісь «Партийное Строительство» здолее толькі ў той час, калі ў ёй прыме самы актыўны ўдзел кіруючы і нізавы актыў партыі.

Перабудаваньне работы прыстасована да ўмоў рэканструкцыі—такая ўстаноўка часопісі «Партийное Строительство». Дапамагаць часопісі ў дасягненьні гэтай мэты—такі абавязак кожнага члена партыі, кожнага актывістага.

З таварыскім прывітаньнем Рэдакцыя «Известий ЦК ВКП(б)».

ЯК РАСЬЦЕ ПАРТЫЯ

(Вынікі прыёму ў партыю ў другім квартале 1929 г.)

Пытаньні росту партыі павінны быць прадметам нашае пільнае ўвагі. Лістападаўскі пленум ЦК даў арганізацыям зусім выразныя ўказаньні аб рэгуляваньні росту партыі. У сьвятле гэтых пастаноў асабліва важным прадстаўляецца вывучэньне найбольш характэрных момантаў прыёму. У прыватнасьці, вялікае значэньне мае вывучэньне прыёму па кварталах году. Тут мы назіраем пэўныя тыповыя рысы, што паўтараюцца з году ў год. Возьмем для прыкладу вынікі прыёму за другі квартал 1929 г

У першым квартале прынята 95 тысяч кандыдатаў, а ў другім было прынята па нянэўных вестках 50 тысяч, г. зн. 60 проц. прыёму першага кварталу.

Чаму мы маем такі ўпад прыёму? Ці можна гэта тлумачыць «сэзонным» характарам прыёму—пачаткам адпускаў рабочых, ці адцягненьнем партыйных сіл на правядзеньне пасеўнай, хлебазагатоўчай і іншых кампаній.

Каб адказаць на гэта, цікава прасачыць ход прыёму ў другім квартале за апошнія гады.

Гады:	Прынята кандыдат. У 1-м квартале.	У 2-м квартале.	(Зьмены)
1924 г.	125.096	87.234	(—) 30,3
1925 г.	108.215	81.986	(—) 24,2
1926 г.	51.265	44.079	(—) 14,0
1927 г.	25.295	35.192	(+) 39,1
1928 г.	80.600	48.133	(—) 40,3
1929 г.	95,481	58,852	(—) 38,4

Зьніжэньне прыёму ў другім квартале, як бачым, адбываецца году ў год. Выключэньне складае 1927 год, калі ў другім квартале было прынята больш, чым у першым, але гэта тлумачыцца тым, што прыём у першым квартале 1927 г. упаў да нязвычайна нізкіх разьмераў. Наогул-жа веснавы пэрыяд сказваецца на заняпадзе прыёму вельмі моцна.

Аднак, такое рэзкае зьніжэньне прыёму, як у бягучым годзе, наглядалася толькі ў 1924 г. і 1928 г., калі праводзіліся кампаніі па вярбоўцы «Ленінскага і «Кастрычнікаўскага» заклікаў.

Лістападаўскі пленум ЦК, як вядома, вынес пастанову аб недапушчальнасьці «кампаній» у справе вярбоўкі рабочых у партыю. Аднак, у друку адзначаецца рад выпадкаў парушэньня гэтае пастановы. Адны арганізацыі праводзілі кампаніі ў Ленінскія дні, другія, скажам, да 8-га сакавіка прыстасавалі вярбоўку работніц і г. д. Наогул-жа, як відаць, «кампанейшчына» ў прыёме далёка яшчэ ня спынена

Усякая кампанія, як вядома, патрабуе вялікага напружаньня сіл арганізацый. Пасьля кампаній наступае некаторае паслабленьне работы. Як відаць, рэзка зьніжаны прыём кандыдатаў у другім квартале гэтага году можна адносіць іменна за лік ужываньня кампанейскіх прыёмаў пры вярбоўцы рабочых у працягу першага кварталу.

Трэба пры гэтым адзначыць, што зьніжэньне прыёму ў другім квартале адбылося ня ўсюды роўнамерна: па прамысловых, напрыклад, раёнах прыём зьнізіўся супроць першага кварталу на 41,6 проц. (з 41 888 панізіўся да 24.466 чал.), у зямляробчых раёнах—на 38,3 проц. (замест 43.220 прынята 26.658 чал.). а ў нацыянальных краінах і рэспубліках—толькі на 15,8 проц. (прыняць 8.735, замест 10.373 чал.).

Найбольшы упад прыёму праявіўся ў прамысловых раёнах. Між тым, асноўная задача па рэгуляваньні складу партыі заключаецца ва ўцягненьні ў партыю найбольшае колькасьці, іменна, у прамысловых рабочых з вытворчасьці. Такім, параўнаўча невялікі разьмер упаду прыёму ў нацыянальных краінах і рэспубліках, пры значным упадзе ў прамысловых раёнах, цалкам ва ўсёй партыі прыводзіць да адмоўнага вынику.

Справа ў тым, што ў раёнах з мала разьвітой прамысловасьцю спадзяваюцца на вялікі прыцёк рабочых няма чаго; павышэньне ў гэтых раёнах агульнага прыёму кандыдатаў узмацняе ў складзе партыі нерабочую частку і тым затрудняе работу па паляпшэньні складу партыі. Студзеньскай пастановай ЦК устаноўлены гранічныя нормы прыёму ў партыю для непралетарскіх элемэнтаў у такіх разьмерах: для прамысловых раёнаў—у 10 проц., для зямляробчых—у 30 проц. з тым, каб цалкам па партыі рабочыя ў прыёме складалі ня менш 80 проц., а нерабочая частка не перавышала 20 проц.

Паглядзім, наколькі выканана гэта задача ў другім квартале. Процант рабочых і непралетарскіх элемэнтаў у прыёме за гэты квартал наступны:

Прамысловыя раёны . .	87,7	12,0
Зямляробчыя	69,0	31,0
Нацыянальн. рэспублікі і краіны	64,9	35,1
У сярэднім па партыі . .	76,1	23,9

Вынік работы партарганізацый у галіне прыёму, як бачым, атрымаўся нядобры: і цалкам па партыі і па прамысловых і зямляробчых раёнах партарганізацыі перайшлі пастаўленую ім грань і дапусьцілі прыём нерабочых элемэнтаў вышэй устаноўленай нормы. З посьпехам выканалі сваю задачу толькі партарганізацыі нацыянальных краін і рэспублік. У якіх процант рабочых у прыёме аказаўся вышэй устаноўленай нормы, а разьмер нерабочай часткі не дасягнуў пастаўленае грані.

У папярэднім квартале малюнак быў іншы: ня гледзячы на значна большы прыём у колькасных адносінах, у прамысловых раёнах рабочыя сярод прынятых складалі 91.5 проц., у зямляробчых раёнах—83,1 проц., у нацыянальных краінах і рэспубліках—71.6 проц., г. зн. ва ўсіх раёнах партарганізацыі ня толькі не парушалі ўстаноўленых норм прыёму рабочых, але значна павялічылі рабочую праслойку сярод нанава прынятых кандыдатаў.

Трэба пры гэтым адзначыць, што ў другім квартале прынята рабочых значна менш, чым у першым, а іменна, 45 тысяч замест 79 тысяч. Лік-жа непралетарскіх элемэнтаў у партыі павялічыўся. Іншымі словамі: партарганізацыі, паслабіўшы ў другім квартале тэмп уцягненьня ў партыю рабочых, адначасова паслабілі сваю ўвагу і па стрыманьні напору ў партыю з боку непралетарскіх элемэнтаў.

Паслабленьне тэмпу работы па вярбоўцы ў партыю рабочых мацнэй за ўсё выявілася на буйных прамысловых прадпрыемствах. Па справаздачах ячэек 198 буйных прадпрыемстваў колькасьць заяў ад рабочых аб пераводзе ў партыю ў другім квартале амаль у два разы меншая, чым у першым. Амаль у такім-жа разьмеры зьнізіўся і прыём у кандыдаты.

Паніжаны прыём у кандыдаты адбываўся адначасова з ростам ліку рабочых усёй прамысловасьці, вынікам чаго зьявілася і зьніжэньне велічыні партпраслойкі на паказаных прадпрыемствах—з 143 камуністых на кожную тысячу рабочых да 139.

* * *

Які-ж склад прынятых з якаснага боку? Пачнем са ступені палітпадрыхтоўкі прынятых кандыдатаў.

У першым квартале скончыўшыя школы палітграматы складалі 30,7 проц., а ў другім—33,2 проц. Бясспрэчна, што гэту акалічнасьць трэба адзначыць, як станоўчае зьявішча. Але ў адносінах прыёму ў партыю зусім няпісьменных партарганізацыі ня толькі не зрабілі посьпехаў, а пагоршылі склад прыёму ў другім квартале: у першым квартале на 1.000 прынятых кандыдатаў «прыходзілася 7 няпісьменных, а ў другім квартале—ужо 12 чалавек.

Як спрыяючы паказальнік, трэба адзначыць рост прыёму жанчын: у першым квартале жанчыны сярод прынятых складалі 16.3 проц., а ў другім—21,1 проц. Павысілася таксама ўдзельная вага камсамольцаў: у першым квартале камсамольцы ў складзе прыёму складалі 26 проц., а ў другім—26,5 проц.

Рад прыведзеных тут кепскіх паказальнікаў, а іменна: зьніжэньне велічыні рабочай праслойкі ў прыёме за другі квартал, павышаны супроць устаноўленага ЦК прыём непралетарскіх элемэнтаў, павышаны прыём няпісьменных і паніжэньне партпраслойкі ў буйных прамысловых прадпрыемствах,—у належнай ступені характарызуюць вынікі работы партарганізацый за другі квартал.

Аб ходзе папаўненьняў партыйных радоў у трэцім квартале ў нас яшчэ няма пакуль што вестак. Але, звычайна, судзячы па мінулым часе, прыём у трэцім квартале бывае яшчэ ніжэйшы, чым у другім.

Наступіў чацьверты квартал, калі прыём значна павышаецца пасьля летняга застою. Перад партарганізацыямі стаіць задача ўзмацніць сваю работу па найбольшай вярбоўцы ў гэтым квартале рабочых з вытворчасьці і гэтым справіць недахопы другога кварталу.

Патрэбнасьць павышэньня ўдзельнае вагі рабочых у складзе прымаемых дыктуецца яшчэ і тэй акалічнасьцю, што на працягу апошніх 9 месяцаў быў ужо дапушчаны па-за плянавы прыём нерабочых элемэнтаў (прынята 29 проц. замест 20) і, значыцца, для дасягненьня задачы, якая стаіць перад партыяй, аб давядзеньні рабочай праслойкі да паловы яе складу патрабуецца або прыём значна большае колькасьці рабочых, чым меркавалася, або яшчэ большае абмежаваньне прыёму нерабочай часткі.

Чыстка партыйных радоў, якая зараз адбываецца, зьяўляючыся лепшым агітацыйным сродкам па ўцягненьні ў партыю рабочых, павінна быць скарыстана магчыма шырэй для выпраўленьня дапушчаных парушэньняў дырэктыў лістападаўскага пленуму ЦК.

Я. ПРЫНЦАЎ.

«Изв. ЦК ВКП(б)»

ПЕРАВЫБАРЫ ДЭЛЕГАТАК

Выправіць недахопы

Перавыбары дэлегатак друкарні і рэдакцыі «Зьвязда» і «Рабочий» прайшлі даволі ажыўлена, але не бяз мінусу. На сходзе было вельмі мала рабочых—13 чалавек. Ды і жонкі рабочых і служачых не аддалі сходу патрэбнае ўвагі — з 60 чалавек зьявілася ўсяго 25 чалавек, ня гледзячы на тое, што быў арганізаваны дзіцячы пакой. Мы ўжо пісалі аб тым, што падбор дэлегатак мінулага году ў друкарні «Зьвязда» быў няўдалы. З 3-х дэлегатак працавала толькі адна. Вось, што гаварыла дэлегатка тав. Цудзіна ў сваёй справаздачы.

— З 17 дэлегацкіх сходаў я наведала 14. Атрымала агульнае разьвіцьцё і пазнаёмілася з асноўнымі задачамі партыі ў бягучым пэрыядзе Але дрэнна было з практычнай работай. Я была прымацавана да сэкцыі аховы здароўя пры гарсавеце. Мне даручылі абсьледаваць трэцюю савецкую больніцу, а калі я на важных прычынах адмаўлялася і прасіла даць другую нагрузку, мая просьба ня была выканана ой дэлегацкі тэрмін скончыўся, а ...ктычная работы я не вяла

У спрэчках выступаўшыя гаварылі, што гарсавет не даволі выразна разьмеркаваў работу сярод дэлегатак. Праграма дэлегацкага сходу ня была ўрэзана з практычнай работай. Жанадз... не наладжваў экскурсій дэлегатак на прадпрыемствы для азнаямленьня дэлегатак з выторчым жыцьцём.

Новаабраным дэлегаткам сход даў наказ рэгулярна наведваць дэлегацкія сходы, актыўна выконваць свае заданьні і рабіць справаздачу аб сваёй працы кожныя тры месяцы

Новаабраныя 4 дэлегаткі тут-жа былі прымацаваны да розных арганізацыі друкарні і рэдакцый.

Е. Э.

На новых рэйках

(Пільня, 19 разьезд, Бабруйскі раён)

Упяршыню ў гэтым годзе ў нас арганізуецца дэлегацкі сход. Да гэтага часу сярод работніц і жонак рабочых ніякай работы не вялося У выніку работніцы вельмі слаба ўдзельнічалі ў вытворчым жыцьці пільні. Жонкі рабочых ніякай грамадзкай работы не вялі.

Нядаўна адбыўся сход жонак рабочых пільні па пытаньні аб арганізацыі дэлегацкага сходу Сход пастанавіў разгарнуць шырокую работу на падрыхтоўцы да выбараў дэлегатак. На сходзе была разгорнута падпіска на пазыку індустрыялізацыі. Жанчыны таксама арганізавалі «суботнік» у фонд індустрыялізацыі краіны.

Сход пастанавіў выклікаць на спаборніцтва на лепшае правядзеньне перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў і лепшую падпіску на пазыку індустрыялізацыі работніц і жонак рабочых пільні Гарадзеч (таго-ж раёну).

Г—он.

Разгорнем падпіску на часопісі „Большевик" і „Большавік Беларусі"

ЯЧЭЙКА КП(б)Б БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК выклікае партыйныя ячэйкі НАРСУВЯЗІ, НАРКАМЗЕМУ, ВСНГ БССР І НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧАГА ІНСТЫТУТУ ІМЯ ЛЕНІНА на спаборніцтва на лепшае распаўсюджаньне часопісяй «Большевик» і «Большавік Беларусі» і на большае ахапленьне палітвучобай партыйцаў і беспартыйных рабочых і служачых.

Умовы спаборніцтва: 1) Дабіцца падпіскі на часопісі «Большевік» і «Большавік Беларусі» ня менш, чым 25% партыйцамі; 2) Да 1-га студзеня 1930 году ахапіць вучобаю партыйцаў на 100 проц. і беспартыйных рабочых і служачых—на 50 проц.

29-га кастрычніка 1929 г., а 19-й гадзіне раніцы ў ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ЦК КП(б)Б (вуліца Карла Маркса, дом № 14)

СКЛІКАЕЦЦА

нарада сакратароў калгаскіх ячэек КП(б)Б

з наступнай абвесткай дня:

1. Аб чарговых задачах партыйнай, выхаваўчай і масава-палітычнай працы ў калгасах і саўгасах.
2. Аб становішчы калгасаў і мерапрыемствах па ўзмацненьні іх.
3. Бягучыя справы.

Рэгістрацыя ўдзельнікаў нарады будзе праводзіцца 19 і 20-га кастрычніка ў сакратара арганізаўзелу ЦК (1-шы паверх, пакой 7).

Па прыезьдзе ў Менск зьяўляцца ў ЦК для рэгістрацыі і атрыманьня памяшканьня.

ЗА НЯУХІЛЬНАЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ САМАКРЫТЫКІ

Віцебскія АК і АКК пабальшавіцку прызналі свае памылкі

Урокі Віцебскай справы аб парушэньні ленінгу самакрытыкі ў пастанове віцебскіх парторганаў, накіраванай супроць газэты «Заря Запада», якая выкрыла непарадкі ў лекавых установах г. Віцебску, патрабуюць таго, каб на іх яшчэ раз спыніцца, як на уроках для іншых партарганізацый. Характэрна, што гэту скраву ня прышлося доўга расьсьледаваць бо пастанова была вынесена ў такой супярэчнасьці з фактамі, што досыць было да выкрытых фактаў дадаць новыя даныя, каб выявіць цяжкую, недапушчальную памылку, скажэньне лёзунгу самакрытыкі ў дзеяньнях віцебскіх АК і АКК.

У **«Зьвязьдзе»** досыць падрабязна былі асьветлены ўсе акалічнасьці гэтае справы. Іх мы ня будзем паўтараць. Важна іншае—**Віцебскія кіруючыя органы сталі на шлях рашучага прызнаньня і выпраўленьня сваёй памылкі.**

Пасьля жорсткай крытыкі дапушчанай віцебскімі АК і АКК памылкі, мы зараз навочна выявілі, што віцебскія парторганы рашуча выпраўляюць сваю палітычную памылку і ідуць па шляху далейшага, яшчэ больш рашучага разгортваньня «рэвалюцыйнай самакрытыкі мас, якая апіраецца на творчую ініцыятыву мільёнаў працоўных» (Сталін).

Віцебскія АК і АКК проста, пабальшавіцку, бясспрэчна прызналі сваю палітычную памылку, скасаваўшы сваю памылковую пастанову. Таварышы аддалі сябе жорсткай самакрытыцы, разгледзелі падрабязна ўсе даныя і прычыны, якія паслужылі да вынясеньня недапушчальнай пастановы. Орган віцебскага акруговага КП(б)Б **«Віцебскі Пралетары»** расказаў падрабязна на сваіх старонках, перад усёй партарганізацыяй, пры значным упадзе ў прамысловых раёнах, цалкам ва ўсёй партыі прыводзіць да адмоўнага выніку.

Віцебскія парторганы, якія ажыцьцяўляюць наогул правільна дырэктывы партыі аб самакрытыцы, ня толькі скасавалі сваю пастанову і раскрытыкавалі сваю памылку, але і пайшлі далей па шляху разгортваньня самакрытыкі. На абъяднаным пленуме АК і АКК яны ставяць пытаньне аб далейшым разгортваньні самакрытыкі, аб памылках, якія ёсьць, і намячаюць практычныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні дырэктыў верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б. Віцебскія таварышы давялі сваё няўхільнае жаданьне ратуча выправіць свае асобныя памылкі і недахопы. Вось чаму ЦК і ЦКК ужылі па гэтай справе толькі тую меру ўзьдзейнічаньня, якая дана ў апублікаванай у «Зьвязьдзе» пастанове.

Невыстарчальнае разгортваньне самакрытыкі ў радзе ячэек, арганізацый, сярод прафсаюзаў, матар'ялы чысткі вясковых савецкіх ячэек, абавязваюць нас праверыць, як ажыцьцяўляюцца тыя мерапрыемствы, якія паказаны ў адозьве ЦК КП(б)Б аб самакрытыцы. ЦК і ЦКК ухвалілі рад пастаноў, накіраваных да папярэджаньня падобных памылак у важнейшым пытаньні работы партыі—у справе ажыцьцяўленьня лёзунгу самакрытыкі.

ЦКК асабліва строга падыйшла таксама да адэнкі адносін АКК да гэтай справе. АКК ня здолела правільна наладзіць работу па праверцы газэтных заметак, не праверыла правільнасьці расьсьледваньня камісіі, не абараніла нават тых, праўда, невыстарчальных прапаноў, якія вынесла камісія. АКК не расьсьледвала і не пакарала тых, хто «вяваў» супроць самакрытыкі ў акруговым аддзеле аховы здароўя, ня аб грубых скажэньнях у працы гар. камітэту ўзаемадапамогі.

Таму і ў мэтах дапамогі ў працы АКК, ЦКК намецілі абсьледваньне Віцебскай АКК, каб тым самым дапамагчы замацаваньню тых дасягненьняў, якія ёсьць у віцебскай АКК і садзейнічаць рашучаму выпраўленьню памылак у яе рабоце.

Вядучы барацьбу за разгортваньне самакрытыкі, мы яе вядзем па двух франтох—супроць задушэньня і ігнараваньня самакрытыкі, гэтага мэталу «выхаваньня партыі, рабочае клясы, мас», і з тэй-жа рашучасьцю сулроць апаганеньня самакрытыкі, левых заскокаў, скочваньня да рэцыдываў трацкізму. У гэтым і ў другім выпадку мы вядзем барацьбу за партыйную лінію ў самакрытыцы, мы кіруемся тут тым, што «крытыка нам патрэбна для ўмацаваньня савецкай улады, а не для яе паслабленьня» (Сталін).

Мы ўпэўнены, што ў сьвятле тых дасягненьняў, якія мае ў сваёй рабоце Віцебская партарганізацыя, і тэй практыкі, якую мае арганізацыя ў справе бязьлітаснага выкарчоўваньня недахватаў і скажэньняў, ва ўмовах правільных бальшавіцкіх адносін да крытыкі сваіх памылак з боку віцебскіх АК і АКК, разгортваньне самакрытыкі будзе ўзьнята на вялізную вышыню.

Віцебская партарганізацыя ажыцьцяўіць задачы сьмелага, рашучага разгортваньня масавай пралетарскай самакрытыкі, масавага пралетарскага кантролю зьнізу, задачы, без выпрашэньня якое ня можа быць забясьпечана ажыцьцяўленьне лініі партыі і бязьлітаснае выкарчоўваньне апартуністычных скажэньняў.

Прафсаюзы і барацьба з няпісьменнасьцю

На

СЛАБАСЬЦЬ КІРАЎНІЦТВА ПРАФАРГАНІЗАЦЫЙ ПЕРАШКАДЖАЕ САЦСПАБОРНІЦТВУ

ПРАВЕРКА НЕ АДЛЮСТРОЎВАЕ КАНКРЭТНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНАЎ

Вытворчыя камісіі ў баку ад спаборніцтва

„У нас працкалектыў, а таму ніякага спаборніцтва ня можа быць"

(Менск, ф-ка цацак «Адраджэньне»)

З першага дня ўступленьня ў сацыялістычнае спаборніцтва, калектыў рабочых менскай фабрыкі цацак «Адраджэньне» прайшоў па няправільным шляху.

У ліпені месяцы на фабрыцы паміж некалькімі цэхамі быў заключаны агульны дагавор, які фактычна нічым канкрэтна не абавязваў кожны цэх паасобку. Былі толькі агульныя фразы: «устанавіць прадсьцыпліну», «беражліва і эканомна адносіцца да выдаткаваньня матар'ялаў», «садзейнічаць у арганізацыі брыгад» і г. д.

Калі некалькі месяцаў таму назад дэлегацыя рабочых фабрыкі цацак, якая (дэлегацыя) прысутнічала на агульна-гарадзкой вытворчай канфэрэнцыі, унесла прапанову выклікаць па сацспаборніцтва штотачную фабрыку дык фабком фактычна «спалохаўся» падтрымаць такі выклік, не паставіў гэту прапанову на абгаварэньне рабочых і ініцыятывы дэлегацыі рабочых ня была праведзена ў жыцьцё.

Наогул, трэба адзначыць, што сярод часткі рабочых існуе і па гэты час шкодны погляд: «у нас працкалектыў, таму ніякага спаборніцтва ня можа быць».

Як-жа праходзіла сацспаборніцтва на фабрыцы? Дамо слова насьценнай газэце «Вагранка», якая ў верасьні месяцы піша:

«Многа шумелі ў нас на фабрыцы аб сацыялістычным спаборніцтве, шмат добрых слоў і рэзалюцый было сказана і напісана аб сацспаборніцтве. Але, як заўсёды бывае з правядзеньнем кампаній, гэтыя словы і рэзалюцыі засталіся ў папцы нашых «адказных» дзеячоў. Нашы прафэсыянальныя і партыйныя арганізацыі фабрыкі, як відаць, яшчэ не ўявілі ўсяго палітычнага значэньня сацыялістычнага спаборніцтва. Мы заключылі дагавор, падпісалі, а рэшта—ня наша справа. Грамадзкія рганізацыі ня былі мабілізаваны на папулярызацыю сацыялістычнага спабоніцтва. Рабочыя цэхаў, якія ўступілі ў спаборніцтва, ня ведаюць аб ходзе спаборніцтва і асягнутых выніках. Усё тое, што прароблена, было прароблена толькі самімі майстрамі без актыўнага ўдзелу мас».

У той час, калі многія фабрыкі і заводы з месяц таму назад прыступілі і зараз ужо канчаюць праверку выкананьня дагавораў па сацспаборніцтве, на фабрыцы «Адраджэньне» фабкомаўцы «чакалі дырэктыву» з ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў. Толькі гэтымі днямі, пасьля атрыманьня з ЦП саюзу і ЦСПСВ інструкцый (якія, трэба адзначыць, прышлі з вялікім спазьненьнем) на агульным сходзе рабочых было абрана 6 цэхавых праверачных брыгад і ЧКК. Цікава адзначыць, як паказённаму былі праведзены гэтыя выбары. Замест таго, каб склікаць сходы рабочых па асобных цэхах (усяго на фабрыцы працуе 660 рабочых) і правесьці наперад шырокую растлумачальную кампанію аб палітычным значэньні праверачнай кампаніі, быў скліканы ў абедзены перапынак **толькі адзін агульны сход усіх рабочых і «залпам»** за паўгадзіны абраны былі, на раней намечаных кандыдатурах, 6 цэхавых брыгад і ЧКК. Нават не пацікавіліся, можа ёсьць добраахвотнікі ў праверачныя брыгады.

Зараз ужо была склікана агульная нарада праверачных брыгад, намечаны цэлы плян работы брыгад, але грамадзкія арганізацыі, рабкоры і сама рабочая маса яшчэ слаба мабілізаваны наўкола праверкі выкананьня сацдагавароў. Ёсьць небясьпека, што палітычнае значэньне і сама праверка, калі ня будуць прыняты адпаведныя захады з боку фабкому і партыйнай ячэйкі, будзе змазана.

В.

На мясцох не замацавалі посьпехаў сацспаборніцтва

Сацыялістычнае спаборніцтва, у якое ўступілі ўсе прадпрыемствы Савецкага Саюзу, абярнулася зараз у **баявую зброю рабочай клясы ў барацьбе за ажыцьцяўленьне намечаных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.** Станоўчыя вынікі калектыўных намаганьняў, творчай самадзейнасьці і энтузіязму мас ужо выразна адчуваюцца ў рабоце прамысловасьці.

Прафэсыянальныя арганізацыі павінны былі **замацаваць творчы энтузіязм рабочых мас, накіраваць яго па рэчышчы штодзённага ўдзелу рабочых у жыцьці прадпрыемства, ажывіць работу вытворчых камісій, зрабіць іх баявымі органамі сацыялістычнага спаборніцтва.** Як выконваюць прафарганізацыі гэтыя задачы?

Ліст УсеЦСПС вусім правільна адзначыў, што **прафарганізацыі дрэнна кіруюць работай па сацыялістычным спаборніцтве.**

Вось рад прыкладаў з жыцьця нашых прадпрыемстваў. На **швэйнай фабрыцы «Камінтэрн»** у першы час пасьля заключэньня сацыялістычнага дагавору значна павялічыўся выпуск прадукцыі, зьменшыліся прагулы і спазьненьні. Да чэрвеня фабрыка дасягнула выніжэньня сабекошту на 4 проц.

У ліпені і наступных месяцах тэмп работы зьменшыўся, прадсьцыпліна ў цэхах упала, вырасьлі прастоі, павялічыўся сабекошт прадукцыі. Лічбы красамоўна гавораць аб гэтым. У чэрвені было выпушчана прадукцыі 88-93-101 проц. колькасьці, намечанай дагаворам (па розных цэхах), у ліпені і наступных месяцах — 67-74-89 проц.

Сабекошт прадукцыі вырас на 1-2 проц.

У апошні час, як адзначае насьценгазэта фабрыкі, сацспаборніцтва не адчуваецца на прадпрыемстве, рабочыя, як быццам, забыліся аб узятых на сябе абавязках. Дзе прычына гэткага зьявішча? Прычына — **фабком не кіраваў спаборніцтвам, ён не замацаваў энтузіязму рабочых у часе заключэньня дагавору, вытворчая камісія займалася, чым хочаш, толькі не спаборніцтвам,** бюро парткалектыву стагла ў баку ад інтарэсаў вытворчасьці. Насьценгазэта **«Голас швэйніка»** вусім правільна ахарактарызавала бязьдзейнасьць арганізацый фабрыкі, як неразуменьне сваіх клясавых задач, як здачыную сьпічку.

Амаль аналёгічны малюнак мы маем **на гуце імя Домбаля.** Глум і брак пачыньня яшчэ вельмі высокі, прагулы па няўважлівых прычынах узрасьлі на 50-63 проц. Абавязкі, узятыя рабочымі ў сацыялістычным дагаворы, слаба выконваюцца. Спаборніцтвам не ахоплены ўсе рабочыя. Молодзь, якая зьявілася значнішчыкам спаборніцтва, зараз у ім слаба ўдзельнічае. І тут вытворчыя камісіі не ўзяліся за штодзённае кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам, не распрацоўваюць выпікаў спаборніцтва, ня склікаюць нарад ударных брыгад.

Насьценгазэта калектыву Віцебскага ЦРК паведамляе, што мясцкомы саюзу савецкіх служачых да гэтага часу ня кіруюць спаборніцтвам, ня цікавяцца ім, у пляны культкамісій моманты сацыялістычнага спаборніцтва вусім ня ўключаны.

Як бачым, **многія прафарганізацыі не ўсьвядомілі новых задач прафработы, не павярнуліся тварам да вытворчасьці, ня выканалі дырэктыў УсеЦСПС.** Праверка выкананьня сацдагавароў павінна паслужыць моцным штуршком да пералому ў рабоце прафэсыянальных органаў.

Б.

Адбылі павіннасьць

На цьвіковым заводзе «Чырвоны Кастрычнік» (Аршаншчына) ужо праведзена праверка выкананьня дагавароў па сацыялістычным спаборніцтве. Але дрэнна толькі тое, што гэта праверка ня мела масавага характару: аб ёй амаль нічога ня ведала значная колькасьць рабочых. Даклад аб выніках праверкі быў заслуханы толькі 185 чал. з агульнай колькасьці рабочых заводу ў 287 чалавек. Праверка праводзілася не праз брыгады. Ячэйка і заўком замест брыгад для праверкі сацдагавору вылучылі спэцыяльныя тройкі. Матар'ялы праверкі не паказваюць ніякіх канкрэтных дасягненьняў ці недахопаў, зусім не паказана, наколькі той ці іншы пункт сацдагавору быў выкананы. У пратаколах праверкі толькі зроблены адзнакі па пунктах сацдагавору: «лічыць выкананым», «лічыць часткова выкананым», або «ня выкананы». А як і наколькі выкананы той ці іншы пункт — аб гэтым нічога няма ні ў пратаколах, ні ў дакладах абсьледваньня. Невядома, як камісія лічыць праведзена спаборніцтва на заводзе — добра, ці дрэнна. Можна быць упэўненым, што дрэнна, бо арганізаваныя ў пачатку ўступленьня заводаў ў спаборніцтва ўдарныя брыгады да гэтага часу не павялічыліся і наогул працавалі кепска, ня было спаборніцтва паміж асобнымі рабочымі. Для праверкі выкананьня сацдагавору паводле дырэктыў УсеЦСПС, акрпрафбюро спачатку камандыравала аднаго прадстаўніка. Але заўком заводу ў асобе старшыні Паборцава і парт'ячэйка ў асобе сакратара Магарылы з свайго боку праявілі самы заядлы кансэрватызм. Яны палічылі, што праверка ў іх ужо зроблена, што правяраць зноў не патрэбна, а таму для працы прадстаўніка на заводзе яны зусім не патурбаваліся стварыць адпаведныя ўмовы. Некалькі раз прадстаўнік АПБ зварачаўся, каб яму дапамаглі, але ўсё нічога ня выходзіла, і толькі тады, калі АПБ зьвярнулася да акругкому партыі з просьбай прыняць меры, кансэрватызм Паборцава і Магарылы быў разьбіты. Будзем спадзявацца, што цяпер праверка выкананьня дагавароў па спаборніцтве на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» будзе праведзена належным і масавым парадкам, бо для арганізацыі праверкі і кіраўніцтва ёю АПБ накіравала на завод двух новых сваіх прадстаўнікоў. Патрэбна і самім рабочым заводу прыняць актыўны ўдзел у праверцы выкананьня сацдагавору. Гэта абавязак кожнага рабочага.

А. МІЛАШЭЎСКІ.

Хроніка спаборніцтва

Цэхі **шавецкай майстэрні Гандальбуду** заключылі між сабой дагавары на сацспаборніцтва. У дагаворах яны абяцаюць канчаткова зьнішчыць брак і прагулы і павялічыць прадукцыйнасьць працы на 3 проц., эканомна скарыстоўваць матар'ялы, асьцярожна абыходзіцца з інструмантамі і інш.

Добруская рабочая бібліятэка пры напіровай фабрыцы «Гэрой Працы» выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва Чашніцкую рабочую бібліятэку пры ф-цы «Чырвоная Зара» і Шклоўскую рабочую бібліятэку пры ф-цы «Спартак». Разам з выклікам Добруская бібліятэка пасылае бібліятэкам плян правядзеньня бібліятэчнага паходу і абяцае ажыцьцявіць лёзунгі «Кнігу ў масы» і «Бібліятэкі на дапамогу сацыялістычнаму будаўніцтву».

Цэлы раён Клімавіцкаму раёну

КЛІМАЎШЧЫНА МОЖА ЗАСТАЦЦА БЕЗ АГРАНОМАЎ, КАЛІ НЯ БУДУЦЬ УЖЫТЫ ТЭРМІНОВЫЯ МЕРЫ

У Клімавічах будзе арганізавана машына-трактарная станцыя

Ва ўчарашнім нумары нашай газэты мы паведамлялі, што для замацаваньня дасягненьняў у Клімавіцкім раёне масавай калектывізацыі патрэбны тэрміновыя меры. Патрэбны каморнікі і аграномы, адчуваецца недахват складаных машын.

Наш супрацоўнік высьветліў, што робяць НКЗ, Белкалгассаюз і інш. установы для дапамогі Клімаўшчыне. У выніку выявілася, што, ня гледзячы на дырэктывы адпаведных органаў, ні аграномы, ні каморнікі для Клімавіцкага раёну яшчэ ня вылучаны і туды не накіраваны.

Прынятыя ў гэтых адносінах Белкалгассаюзам меры зусім не гарантуюць, што Клімавіцкі раён атрымае агранамічную сілу ў бліжэйшы час. Калгассаюз, праўда, закантрактаваў у Барысаўскім тэхнікуме 16 агранамаў, але яны прыедуць у Клімаўшчыну не раней, чым вясною. Наркамзем абяцаў перакінуць з іншых месц 20 агранамаў, але і гэта пакуль што не ажыцьцёўлена.

Магілеўскі акркалгассаюз парашыў падабраць 10 гаспадарчых працаўнікоў да накіраваньня іх у калгасы Клімаўшчыны. Белкалгассаюз згадзіўся нават узяць на сябе ўтрыманьне гэтых працаўнікоў, пакуль калгасы ня стануць на ногі. Да гэтага часу і гэтае мерапрыемства ня выканана.

Такім чынам, Клімавіцкі раён масавай калектывізацыі застанецца на працягу ўсёй зімы без агра-абслугоўваньня, калі тэрмінова ня будуць ужыты рашучыя меры.

Некалькі лепш стаіць справа з арганізацыйнай работай. Зараз у Клімавіцкім раёне працуе спэцыяльны інструктар Белкалгассаюзу, які складае пляны асобных калгасаў. Работнікі катэдры арганізацыі буйной гаспадаркі Беларускай Акадэміі Навук зараз працуюць непасрэдна ў Клімавіцкім раёне над мэтодыкай арганізацыі буйных гаспадарак. Гэтымі днямі туды-ж выехаў экзамэнсты беларускага дасьледчага інстытуту Буйко для прыняцьця ўдзелу ў арганізацыі буйных калгасаў.

Па думцы Белкалгассаюзу, у даны момант нічога нельга зрабіць для забесьпячэньня Клімавіцкага раёну трактарамі. Аднак, Калгассаюз гарантуе, што калгасы Клімаўшчыны праз месяц ужо пачнуць атрымліваць патрэбныя ім с.-г. машыны і трактары. Паступленьне машын і трактароў скончыцца яшчэ да вясны.

Усяго ў гэту восень і ў першыя месяцы зімы Клімавіцкі раён атрымае 30 замежных трактараў «Інтэрнацыянал» і наступныя трактарныя прычэпныя машыны: 6 дыскавых радковых сяўрак, тры складаныя малатарні продукцыйнасьцю ў 1.200 п. у дзень (за 8 гадз.), 20 камплектаў барон, 14 вазоў, 4 дыскавыя бароны, 4 балотныя плугі, тры бульба-капалкі, тры сенакасілкі, тры снопавязалкі, 6 сяўрак для мінеральных угнаеньняў, 30 трохлемешных культурных плугоў «Ліга Джэнісэ».

Ні трактары, ні машыны ня будуць разьмеркаваны па асобных калгасах. Усё гэта будзе сканцэнтравана на машына-трактарнай станцыі ў Клімавічах. Адсюль трактары і машыны будуць накіроўвацца ў пэўныя калгасы раёну ў залежнасьці ад патрэб.

Л.

Клясавы вораг на Аршанскім чыгуначным вузле

11 аварый за 11 дзен кастрычніка

Работа аршанскіх прафарганізацый кульгае на абедзьве нагі

АРШАНСКІЯ ЧЫГУНАЧНІКІ ДАДУЦЬ ШКОДНІКАМ ПА РУКАХ

Згодна дырэктыў адпаведных органаў рабочыя службы руху і цягі павінны перайсьці 15-га кастрычніка з 12-гадзіннага дзяжурства на 8-гадзіннае. Гэтае мерапрыемства сустракае ўпартае супраціўленьне тэй часткі рабочых, якая зьвязана са сваімі гаспадаркамі ў вёсцы, або займаецца так званым мяшочніцтвам. 12-гадзіннае дзяжурства давала ім права адпачываць 24-36 гадзін, а гэта давала ім магчымасьць 12-16 гадзін працаваць на сваёй гаспадарцы, або езьдзіць за некалькі станцый за прадуктамі. Праўда, на дзяжурствы гэтыя рабочыя прыходзілі заспаныя, стомленыя, адсюль — вялікая колькасьць няшчасных выпадкаў, прагулы, няўважлівыя нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў і г. д. Усё гэта вельмі дрэнна адбівалася на вытворчасьці. **Але людзей з кулацкай ідэалёгіяй і мяшочнікаў інтарэсы вытворчасьці зусім ня цікавяць.**

Асабліва абураюча трымаюць сябе адсталыя элемэнты сярод рабочых **Аршанскага вузла.** Відавочна, тут ёсьць уплыў кулацкай агітацыі ў сувязі таксама з хлебазагатоўкамі.

5-га кастрычніка на сходзе рабочых службы руху ў часе дакладу ДН (начальніка 2-га аддзяленьня вучастку) па пытаньні аб 8-гадзінным дзяжурстве, нехта з месца крыкнуў:

— **Калі будзе праведзена 8-гадзіннае дзяжурства, будзем біць вагоны...**

Прадстаўнік Белбюро ЦК чыгуначнікаў, які прысутнічаў на гэтым сходзе, у адказ на гэту рэпліку выступіў з рэзкім адказам. Але такое «рэагаваньне» ня шмат дапамагло.

За апошні час на вучастку 2-га аддзяленьня здарыўся рад дзіўных выпадкаў, якія даюць падставу меркаваць, **што шкодныя элемэнты сярод чыгуначнікаў выконваюць сваю пагрозу.**

1-га кастрычніка на ст. Прыяміна ў часе манэўраў пашкоджаны два вагоны. 4-га кастрычніка, як быццам наўмысьля, таварны цягнік быў падаены на заняты шлях. Толькі выпадкова ня здарылася няшчаснага выпадку. 6-га кастрычніка на разьезьдзе № 3 здарылася сутычка цягнікоў, у выніку якое разьбіта 6 вагонаў, пашкоджана 9 вагонаў і два паравозы і разбураны шлях даўжынёю ў 50 мэтраў. 9-га кастрычніка — зноў два няшчасныя выпадкі, 10-га — 3 выпадкі, 11-га — зноў два.

Наогул, **за 11 дзён кастрычніка зарэгістравана 11 сутычак цягнікоў і аварый,** у выніку якіх разьбіта 7 вагонаў, папсавапы 4 паравозы і 19 вагонаў і разбурана звыш 100 мэтраў шляху.

Прычыны большасьці гэтых аварый прыводзяць да думкі, што **мы тут маем справу з яўным шкодніцтвам.** Такой-жа думкі прытрымліваюцца і члены Белбюро ЦК чыгуначнікаў.

Характэрна, што **ў Аршанскім вучпрафсожы няма падліку сацыяльнага складу рабочых,** і таму магчыма, што **ў асяродзішча аршанскіх чыгуначнікаў залезьлі кулацкія элемэнты.**

Пры яўна невыстарчальнай прафэсыянальнай рабоце аршанскага вучпрафсожу кулацкая агітацыя змагла знайсьці сярод адсталых груп прыхільнікаў. А гэта не сакрэт, што аршанскія прафработнікі **не вядуць належнай культурна-выхаўчай работы,** не арганізоўваюць масы наўкола важнейшых палітычных пытаньняў, а наадварот, часта плятуцца ў хвасьце настрояў адсталых груп, праяўляючы слабую рашучасьць у барацьбе з усімі ненармальнымі зьявішчамі.

Белбюро ЦК чыгуначнікаў дало заданьне члену прэзыдыуму неадкладна выехаць у Воршу і правесьці дэтальнае расьсьледваньне ўсёй справы. Але гэта недастаткова. **Трэба мабілізаваць грамадзкую думку і даць рашучы адпор усім тым, хто прабуе зрываць наша сацыялістычнае будаўніцтва.** Трэба прыняць больш энэргічныя меры для выяўленьня кулакоў і шкоднікаў.

Мы ведаем, што **асноўная маса аршанскіх чыгуначнікаў прадстаўляе сабою моцнае ядро рабочае клясы,** што асноўны кадр чыгуначнікаў сьвядома і аддана адносіцца да выкананьня сваіх абавязкаў, з энтузіязмам праводзіць сацыялістычнае спаборніцтва, робіць вельмі шмат для таго, каб не адставаць ад усёй рабочай клясы.

Мы ўпэўнены, што асноўная маса чыгуначнікаў Аршанскага вузла рэзка асудзіць факты шкодніцтва і прыме ўсе меры, каб у корані спыніць далейшыя вылазкі нашых клясавых ворагаў.

П—н.

Адміністрацыя распусьціла ударныя рабочыя брыгады

Бязьдзейнасьць партыйнай ячэйкі і мясцкому Замест скарачэньня тэрміну прастояў вагонаў — павялічэньне

(Служба цягі Аршанскага чыгуначнага вузла)

Мы сёньня спынімся выключна на абураючым факце — правале сацспаборніцтва на адным з вучасткаў Аршанскага чыгуначнага вузла — службе цягі.

Перш за ўсё аб тым, што аршанскія чыгуначныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі лічаць спаборніцтва ня штодзённай упартай работай, а часовай кампаніяй. «Правялі кампанію і з плеч далоў». Спаборніцтва на аршанскіх чыгуначных бюракратаў зваліласся, як сьнег на галаву сярод яснага дня: «Вяземскія рабочыя чыгуначнікі выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва мясцком службы цягі ст. Ворша».

Зусім раптоўная і нечаканая рэч. Доўга ідбы бюракратаў абліваліся потам на пасяджэньнях па выпрацоўцы «канкрэтных мерапрыемстваў». Выпрацоўвалі, перапрацоўвалі, ды зноў выпрацоўвалі. Так у габінэтах пачалося сацыялістычнае спаборніцтва.

На скліканы сход рабочых, дзе разглядаліся «канкрэтныя мерапрыемствы», з 900 рабочых зьявілася толькі 400. Старшыня мясцкому за 5 мінут «растлумачыў асноўныя задачы», а таму і выказванца ня было патрэбы. Праголасавалі, і гэтым пачалося спаборніцтва. І далей ні партыйная, ні камсамольская ячэйкі, ні мясцком належнай увагі спаборніцтву не аддавалі. Вакол гэтага пытаньня не мабілізавалі пралетарскай грамадзкасьці, а таму ні вытворчая нарада, ні вытворчыя камісіі, ні тэхнічна-інжынэрны пэрсанал у спаборніцтве ня ўдзельнічалі. Нават у насьценгазэце не турбаваліся папулярызаваць і належным чынам асьвятляць задачы сацыялістычнага спаборніцтва.

Праз некаторы час найбольш актыўная і адданая частка рабочых, камуністыя і камсамольцы (між іншым, далёка ня ўсе) сацыялістычнае спаборніцтва зразумелі ня як кампанію, а як сыстэматычную, штодзённую ўпартую работу, як камуністычны мэтад працы. Яны арганізавалі ўдарную брыгаду. За кароткі час брыгада паказала рэкордныя вынікі — прадукцыйнасьць працы павялічылася амаль у паўтара разы, вусім зьнішчыла прагулы, п'янства. Брыгада зьявілася першай ластаўкай у прыкладнай, сумленнай упартай рабоце на прадпрыемстве. Здавалася, што як партыйныя, так і прафарганізацыі павінны былі-б усімі сіламі падтрымаць брыгаду. Скарыстаць практыку брыгады ў другіх цэхах, уцягнуць новыя колы рабочых у сацыялістычнае спаборніцтва па прыкладзе першай брыгады. Але ні прафарганізацыя, ні партыйная ячэйка ніякай увагі на брыгаду не зьвярнулі. Ніхто з кіраўнікоў ячэйкі брыгаду не падтрымаў, нават тады, калі адміністрацыя перакінула рабочых-брыгадзнікаў у іншыя цэхі. Брыгаду разагналі. Разгон брыгады адміністрацыя тлумачыла тым, што нібы ў інтэрэсах вытворчасьці трэба было перакінуць рабочых у другія цэхі. На самой-жа справе было зусім ня так.

Пасьля гэтага рабочыя арганізавалі новую ўдарную брыгаду (аб чым ячэйка нават ня ведала). Хутка адміністрацыя зноў і другую брыгаду распусьціла. Але рабочыя не здаліся. Яны арганізавалі трэцюю брыгаду. Адміністрацыя распусьціла. Арганізавалі чацьвертую — адміністрацыя абяцае таксама распусьціць. На чале адміністрацыі стаіць пейкі Дуцман. Роспуск брыгад—справа яго рук.

У сацыялістычным спаборніцтве ўдзельнічае зусім нязначная частка рабочых. Дадатных вынікаў спаборніцтва зусім няма. Замест зьніжэньня прастояў вагонаў — ёсьць узрост з 14 да 16 дзён прастою (прастоі на рамонце).

Мы з усёй рашучасьцю падкрэсьліваем правал сацспаборніцтва ў прадпрыемствах службы цягі Аршанскага чыгуначнага вузла.

Нас цікавіць, чаму партыйны калектыў чыгункі, вучпрафсож ня ўжылі ніякіх захадаў да выпраўленьня дапушчаных памылак ячэйкай і мясцкомам. Чаму парткалектыў не зацікавіўся работай і роспускам ударных брыгад?

Чыгуначныя бюракраты павінны за правал сацыялістычнага спаборніцтва адказаць перад пралетарскай грамадзкасьцю.

Ул. СТРЫГОЦКІ.

КУЛАКІ СХАВАЛІСЯ ЗА ПЛЯЧЫМА НЕКАТОРЫХ РВК І СЕЛЬСАВЕТАЎ

Дырэктыва ўраду аб індывідуальным ападаткаваньні кулакоў нявыканана

Грубыя скажэньні клясавай лініі ў сельгаспадатку

Скажэньне клясавай лініі ня мінула і Меншчыны

Мы ўжо ня раз на старонках «Зьвязды» адзначалі (на паставе вестак з месц) рэзкае скрыўленьне клясавай лініі пры спагнаньні сельгаспадатку ў Беларусі. **Гэтае скрыўленьне яскрава выражаецца пераважна ў недавыяўленьні кулацкіх гаспадарак для індывідуальнага іх абкладаньня.**

Непаралкі і брыдоты ў гэтай галіне, права-апартуністычныя тэндэнцыі, якія выражаюцца ў яўных паблажках кулаком, у палягчэньні ім падатковага ня́жару, у асабліва рэзкай форме былі выяўлены ў Гомельшчыне—аб гэтым мы ў свой час сыгналізавалі (выдзелена вараз асобная камісія займаецца абсьледваньнем работы па сельгаспадатку ў Гомельшчыне). На гэты раз мы гэта адлюстроўем фактамі, выяўленымі ў найбольш блізкай да нас Менскай акрузе.

Адкрытыя паблажкі купа ом

Вось у **Сялецкім** сельсавеце **(Грэскі раён)** з 31 гаспадаркі з даходам звыш 500 руб. абкладзена індывідуальна толькі 3, але гэтыя 3 гаспадаркі зьдзяляюцца ўжо такімі багатымі кулацкімі гаспадаркамі, што шукаць там непрацоўных даходаў ня прыходзілася, бо яны і сьляпому відны (наліччa паравога млыну і інш.). Вось група кулачак, вызваленых ад індывідуальнага абкладаньня: **Цьвірка** Дар'я, **Клочка** Франя і **Верашчака** Зося—у кожнае з іх па 12-15 дзес. зямлі, многа буйной і дробнай жывёлы, сыстэматычна карыстаюцца наёмнай сілай і акрамя таго спэкулююць—даюць хлеб на адработак, або гандлююць жывёлай.

Купак кулака бачыць здалёк

У Сялецкім сельсавеце бедната неарганізавана, знаходзіцца пад уплывам шматлікіх заможнікаў і запалохана апошнімі. Работы з беднатой там няма каму весьці, бо няма ні партыйнай, ні камсамольскай ячэйкі. Праўда, ёсьць адзін партыец Алесь **Кашкоўскі,** старшыня праўленьня Абчынскага спажывецкага т-ва, што мае вельмі заможную гаспадарку, якую беднякі адносяць да тыпу кулацкіх.

Гэты самы партыец Кашкоўскі, які зьяўляецца старшынёй камісіі па садзейнічаньні хлебазагатоўкам, скарыстаўшы адсутнасьць члена РВК, дабіўся вызначэньня вызначанай для яго лічбы хлеба для здачы (гэты ўчынак потым быў выпраўлены прэзыдыумам сельсавету.).

У гэтым-жа сельсавеце сакратар таксама мае даволі заможную гаспадарку, а адзін з членаў сельсавету—Рачок—займаецца купляй і перапродажам збожжа. **Складаецца агульнае ўражаньне, што ў гэтым сельсавеце кулак кулака бачыць здалёк і адзін другога падтрымлівае.**

„Глеба дрэнная—ня родзіць кулакоў"

Варта яшчэ спыніцца на **Зенькаўскім** сельсавеце **(Вузьдзенскі раён),** у якім—«няма кулакоў». Вось, напрыклад, хто там вызвалены ад індывідуальнага абкладаньня—**Луцэвіч Р. (вёска Выдрыца)** 29,5 дзес. зямлі, 4 штукі буйной і 10 дробнай жывёлы, плоцінь 172 руб. падатку ў звычайным парадку і акрамя таго мае значны неаямляробчы прыбытак. Такіх нявыяўленых кулакоў там ёсьць многа.

Між тым, **у гэтым сельсавеце знаходзіцца партыйная і камсамольская ячэйка, старшыня і сакратар сельсавету—партыйцы.**

Як-жа яны выяўляюць кулакоў? Склікалі сход беднаты і вынесьлі пастанову—кулакоў, бач, няма таму, што там зямля нядобрая, а не таму, што там няма гаспадарак з непрацоўнымі, эксплёататарскімі даходамі.—Глеба, бачыце, дрэнная—ня родзіць кулакоў.

Цікава вось што—**калі ў гэтым сельсавеце правальваецца якая-небудзь кампанія, дык мясцовыя работнікі крычаць—«кулакі зрываюць работу», а калі трэба выявіць кулакоў для індывідуальнага абкладаньня, дык тыя самыя работнікі заяўляюць—«у нас кулакоў няма».** За такімі словамі, якім нельга верыць, ідуць справы, якіх нельга цярпець.

У Камяноцкім сельсавеце (Вузьдзенскі раён) таксама ёсьць цэлы рад кулацкіх гаспадарак, ня выяўленых і не абкладзеных індывідуальна. Калі інструктар Наркамфіну, абсьледуючы гэты сельсавет і выявіўшы неабкладзеныя індывідуальна кулацкія гаспадаркі, запытаў з гэтага поваду старшыню сельсавету-партыйца, то апошні адказаў: «ня ведаў». Дый як яму было ведаць, калі ён, выявіўшы 17 кулакоў, на гэтым супакоіўся і больш гэтай справай ня цікавіўся.

Ксёндз прыехаў — пленум сельсавету зачыняецца

У заможным **Нарэйкаўскім** сельсавеце (Койданаўскі раён). больш паловы кулацкіх гаспадарак (41) засталіся ня выяўленымі і не абкладзенымі індывідуальна. Сярод вызваленых ад індывідуальнага абкладаньня фігуруюць, напрыклад, такія «беднякі»: **Я. Эйсмонт**—19 дзес. зямлі, 5 галоў буйной і 13 галоў дробнай жывёлы, меў 750 р. даходу ад продажу трускавак з свайго гароду, карыстаўся наёмнай працай, або яшчэ **Варатніцкі Напальён**—зямлі 23,5 дз. (гэта ўжо пасьля абрэзкі, праведзенай у 1923 годзе), 7 галоў буйной і 13 дробнай жывёлы, карыстаецца наёмнай рабочай сілай.

У гэтым моцна кулацкім сельсавеце бедната знаходзіцца пад уплывам кулакоў. Характэрны наступны выпадак, які меў месца ў гэтым сельсавеце. **У той час, калі праходзіў пленум сельсавету, была атрымана вестка што ксёндз прыехаў, і вось з-за такога «ўрачыстага» моманту быў спынены пленум.**

У Беларусі, згодна заданьня, трэба было абкласьці ў індывідуальным парадку ня менш 2 проц. усіх сялянскіх гаспадарак (з ліку кулацкіх), а фактычна абкладзена толькі 1,65 проц. **Гэтае недаабкладаньне даволі значнае і яго нельга цярпець. На недавыяўленьне кулацкіх гаспадарак у Беларусі зьвярнулі ўвагу ў Маскве і пытаюцца: дзе вашы кулакі, куды яны падзеліся?**

З гэтымі хібамі—ці гэта ёсьць расхлябанасьць і нядбайнасьць, ці дрэнна ўтоеныя кулацкія тэндэнцыі з боку некаторых работнікаў, трэба скончыць раз і назаўсёды. Недабраную колькасьць кулацкіх гаспадарак трэба неадкладна выявіць для дадатковага іх абкладаньня ў індывідуальным парадку. **Кулацкія гаспадаркі, якія зварачаюцца да сыстэмы ўсякага роду адцяжак, павінны на працягу кастрычніка месяца поўнасьцю ўнесьці ўсе належныя з іх плацяжы па сельгаспадатку — ніякія адтэрміноўкі, ніякія паслабленьні тут ня могуць быць дапушчаны.**

Дапушчаныя на мясцох скрыўленьні клясавай лініі пры спагнаньні сельгаспадатку павінны быць неадкладна гаспадатку павінны быць неадкладна боку бядняцкіх сялянскіх мас.

Д. НЯФЭДАЎ.

ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ ДНЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Тысячы сялянскіх гаспадарак касуюць векавыя межы

За тыдзень калектывізавана 15.000 гэкт.

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). Рагачоўскі раён паставіў перад сабой адказьнейшую задачу — ахапіць калектывізацыяй 20.000 гэкт. раёну да 1930 г. з тым, каб у будучым годзе цалкам калектывізаваць 10 сельсаветаў на плошчы 47.000 гэкт.

Бядняцка - серадняцкія масы Рагачоўшчыны з уздымам сустрэлі пачынаньне раённых партыйных і савецкіх арганізацый. **На працягу аднаго тыдню калектывамі ахоплена 15.000 гэкт.**

Сяляне, якія выступаюць на сходах, заяўляюць, што з калектывізацыяй у нас спазьніліся гадкоў на пяць. **Таму зараз трэба нагнаць прапушчаны тэрмін.**

Экспанаты на выстаўцы калектывізацыі ў менскім Доме Селяніна

24.000 пудоў збожжа ў дзяржаўныя засекі

МАГІЛЁЎ. (Наш кар.). У дзень ураджаю і калектывізацыі на ўсіх прадпрыемствах і ўстановах адбыліся сходы з удзелам калгасьнікаў з падшэфных калгасаў. На сходах рабочымі ўхвалены пастановы аб аборы сродкаў **на арганізацыю трактарнай калёны.**

Рабочыя заводу «Адраджэньне» і электрастанцыі пастанавілі адпрацаваць на карысьць трактарнай калёны 6 гадзін, рабочыя заводу Лекерта—таксама 6 гадзін, чыгуначнікі адпрацавалі дзень. Амаль па ўсіх установах праводзіцца збор сродкаў па падпісных лістох.

У нядзелю 13 кастрычніка вуліцы Магілева былі перапоўнены чырвонымі абозамі. Чатыры абозы, **арганізаваныя беднякамі і сераднякамі Магілеўскага і Лупалаўскага раёнаў, даставілі на ссыпныя пункты 12 тысяч пудоў збожжа.** Сяляне Грабянецкага сельсавету **прывезьлі 3 тысячы пудоў,** Захоцкага—**2 тысячы пудоў,** Ціпаўскага і Пашкаўскага сельсветаў—**7 тысяч пудоў.**

Усяго ў гэты дзень чырвоныя абозы здалі дзяржаве 24 тысячы пудоў збожжа.

Чырвонаармейская камуна на балоце

ПОЛАЦК. (Наш кар.). 40 дэмабілізаваных чырвонаармейцаў №-скай стралковай дывізіі парашылі арганізаваць камуну на абшарах Наўліцкіх балот, парослых чахлымі хмызьнякамі і мохам.

Шмат труднасьцяй сустракалі ініцыятары камуны на сваім шляху.

Адсутнасьць кватэр для жыльля, адсутнасьць сродкаў стваралі амаль немагчымыя ўмовы для работ. Але ўпартая воля і энэргія ініцыятараў перамаглі ўсе труднасьці. У дзень калектывізацыі камуна падвяла вынікі сваёй работы.

Зараз у камуне налічваецца 7 коняй, 10 кароў, маемасьці на 3.500 рублёў. На месца камуны перавезена 10 будынкаў; засеяна 26 гэктараў азімага жыта, падрыхтавана 50 гэктараў балотнага масыву. На балотных абшарах працуюць 3 трактары.

За невялікі тэрмін існаваньня камуны ў рады камунараў упягнуты 3 бядняцкія гаспадаркі. Хутка камуна ахопіць балотны масыў з 200 гэкт. зямлі.

Асаблівую дапамогу камунарам зрабіла №-ская стралковая дывізія, якая забясьпечыла камуну працоў

Сельгаскаапэрацыя як справілася з абслугоўваньнем калгасаў

Не гандляваць, а плянава забясьпечваць калгасы

Усе гаспадарчыя і каапэрацыйныя арганізацыі, якія працуюць у вёсцы і ў тэй ці іншай форме маюць дачыненьне да калектыўных гаспадарак, разглядаюць калгас, як індывідуальную сялянскую гаспадарку, ставячы паміж імі знак роўнасьці. Сыстэма сельгаскаапэрацыі, якая далёка не спраўлялася з сваімі простымі задачамі, у сваіх дзеяньвых зносінах з калгасамі старалася дзейнічаць непасрэдна, мінуючы калгасаюзы, усяляк іх адштурхваючы і адкідаючы ў бок. У выніку-ж атрымаліся правалы. Яскравы прыклад гэтаму мы бачым на хлебазагатоўках.

Калгасы БССР у гэтым годзе ўваходзяць у агульны плян хлебазагатовак у даволі значнай лічбе—3.500 тон збожжавых культур яны павінны здаць дзяржаве. Але вось, сельгаскаапэрацыя, якая забірае гэты хлеб ад калгасаў, да гэтага часу не арганізавала вучоту збору калгасных хлебных пішкаў, і часта сельгаскаапэрацыя не запісвае гэтага хлеба на рахунак калгасаў, а ўключае яго ў лік сваіх уласных загатовак, змазваючы гэтым твар калгасаў.

Мала таго, калгассаюзы, якія заклікакалгасамі, просяць, моляць сельсаюзы—«дайце нам весткі аб зданым вам калгасамі збожжы», а тыя і ў гэтым бесэрамонна адмаўляюць. І выходзіць так, што калгассаюзы, ня маючы дакладных вестак, ня могуць своячасова націскаць на калгасы, і тэмп здачы хлеба замаруджваецца.

Такое-ж становішча мы маем з іншымі прадуктамі, якія здаюцца калгасамі сельгаскаапэрацыі — маслам, малаком, яблыкамі, гародзінай. Прадукцыя калгасаў зараз пачынае займаць даволі значнае месца на беларускім таварным рынку. Але, калі вы захочаце ўлічыць колькасьць прадуктаў, якія здаюцца калгасамі, то сельсаюз і малочныя саюзы вам гэтага не скажуць. Мы тут маем справу або з абураючай нядбайнасьцю, за якую трэба біць, або з наяўным нежаданьнем паказаць усё ўзрастаючую ролю і значэньне калгасаў у сельскай гаспадарцы і на таварным рынку—а за такія тэндэнцыі трэба біць яшчэ мацней.

Тыя факты, якія ёсьць, гавораць, што сельсаюзы і малочныя саюзы ў сваіх зносінах з калгасамі станавіліся ў ролі выключна гандлёвай—галоўнае, пабольш зарабіць грошай. Увесь той прыбытак, які атрымлівацца ад каапэрацыі калгасамі, рассмоктваецца ў апаратах саюзаў і назад у калгасы не вароцца — ці ў выглядзе аграмічнага, або культурнага абслугоўваньня—словам, бяруць і нічога ў замен не даюць. Тут трэба сказаць, што спажывецкая сыстэма, якая толькі пачала працаваць з калгасамі, ужо сёе-тое зрабіла для культурнага абслугоўваньня калгасаў (радыё-устаноўкі, лікпункты і інш.), чаго мы ня бачылі ад сельсаюзаў.

Сельгассаюзам таксама не пашкодзіла-б часьцей заглядваць у калгасы, прыглядзецца да іх работы, даць аграпамічную параду, аказаць якуюсь дапамогу, а ня толькі абмяжоўвацца гандлёвымі мерапрыемствамі.

У Менску вы часта можаце сустрэць калгасьнікаў, якія з сумным тварам швэндаюцца з аднае цэнтральнай установы у другую, абіваюць парогі, просяць прадаць ім фунт цьвікоў, цэмэнту, або кавалак бляхі для пакрыцьця страхі. Нават пры існуючым дэфіцыце ў будаўнічых матэрыялах мы такое становішча павінны расцаніць, як надзвычайна непармальнае. Сельсаюзы, якія ўзялі на сябе манаполію на абслугоўваньне калгасаў, павінны былі заняцца плянамі забесьпячэньня калгасаў, і не расходаваць свае запасы прамтавараў, без задаваленьня патрэб калгасаў.

Зразумела, вялікая доля віны тут падае і на Белкалгассаюз, які больш скардзіўся і плакаў, чым дзейнічаў.

Правесьці гэта мерапрыемства было лёгка, бо ёсьць адпаведныя партыйныя дырэктывы, пастанова саюзнага СНК, а зараз і пастанова ЦВК і СНК БССР аб наданьні калгассаюзам гаспадарча-апэрацыйных функцый. Калгасная сыстэма павінна атрымаць поўную самастойнасьць у кіраваньні сваёй гаспадаркаю з тым, каб ня было разрыву паміж арганізацыйным і гаспадарчым абслугоўваньнем калгасаў, каб яна магла адказваць перад дзяржабаю за правільнае разьвіцьцё і ўзмацненьне калгасаў, за своячасовае іх забесьпячэньне.

Зьезд сельгаскаапэрацыі, які толькі што скончыўся, прыняў рашэньне аб рэарганізацыі усёй сыстэмы. Трэба, каб гэта рэарганізацыя была праведзена не фармальна, каб кожны асобны саюз (паляводны, гародна-садовы, малочна-жывёлагадоўчы) меў выразную вытворчую фізыяномію, каб яго роля ў працы на вёсцы была ясна акрэслена, каб пры зносінах з калгасамі не выпукалася гандлярская тэндэнцыя—пабольш зарабіць. Трэба таксама дапамагчы калгассаюзам скансрулываць свой апарат для поўнага абслугоўваньня калгасаў, каб іх разьвіцьцё магло пайсьці паскораным тэмпам.

Л. Н.

НЕЗАКРАНУТАЯ КРЫНІЦА МІЛЬЁННЫХ ПРЫБЫТКАЎ

За час імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны сьвіны статак у БССР значна зьнізіўся. Але з 1923 г. пачынаецца хуткае аднаўленьне статку, які да 1925 г. дасягае лічбаў 1916 году.

Паступовы рост сьвінога статку адбываўся аж да 1928 году.

У 1923-24 годзе прыбыткі ад сьвінагадоўлі складалі 40 проц. агульнага прыбытку краіны ад жывёлагадоўлі.

У 1928 годзе мы маем скарачэньне сьвінога статку на 1,7 проц., гэты працягваецца і ў 1929 годзе.

Ня прычыны выклікалі скарачэньне сьвінагадоўлі? Асноўныя прычыны—абнасьць і распыленасьць сялянскіх гаспадарак.

Залежнасьць дробных гаспадарак ад стыхійных умоў адбіваецца і на сьвінагадоўлі. Недарод кармоў моцна б'е дробнай сялянскай сьвінагадоўлі і значна менш закранае аграмаджаныя гаспадаркі. Дробная сялянская гаспадарка магла ўправіцца з задачай аднаўленьня сьвінога статку, але далейшае ўзмацненьне і рэарганізацыя сьвінагадоўлі немагчыма ва ўмовах нізкай тэхнікі і распыленасьці індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Правільную арганізацыю сьвінагадоўлі, рост сьвіннога статку можна забясьпечыць толькі шляхам калектывізацыі і арганізацыі буйных сьвіных фабрык.

Рацыянальна пастаўленая сьвінагадоўля павінна быць так арганізавана, каб яе абслугоўвала найменшая колькасьць рабочай сілы, каб рабочая сіла была заменена машынамі. У Даніі, напрыклад, абслугоўваньне 400 сьвіней патрабуе аднаго чалавека.

Буйная сьвінагадоўля дае магчымасьць значна патаніць вытворчасьць. Выкарыстаньне штучных пашт для сьвіней у Амэрыцы дае эканомію 30 проц. зерня. Усё гэта нельга ўжыць у дробнай сялянскай гаспадарцы.

Рацыяналізацыя сьвіной гаспадаркі ў Даніі дала магчымасьць экспартаваць у 1927 годзе на замежны рынак звыш 256 мільёнаў кілё сьвініны на суму 230 мільёнаў рублёў і звыш 37 мільёнаў жывых сьвіней.

У нас, у параўнаньні з Даніяй, значна лепшыя ўмовы для разьвіцьця сьвінагадоўлі. Уся сьвінагадоўля Даніі трымаецца на кармох, якія купляюцца ў іншых дзяржавах, між тым, у Беларусі патрэбныя кармы можна атрымаць у самой гаспадарцы. Але дробнасьць і распыленасьць сялянскай сьвінагадоўлі, нізкая якасьць сялянскай сьвіньні не даюць тэй таварнай прадукцыі і тых сродкаў мільёнаў рублёў, якія дае сьвінагадоўля ў Даніі.

Трэба адзначыць, што нашы калектыўныя гаспадаркі мала ўвагі зварачаюць на аграмаджаньне сьвінагадоўлі. Вельмі часта ў тых калгасах, дзе ўжо абагулена іншая жывёла, сьвінагадоўля застаецца ў індывідуальным карыстаньні.

Калектыўныя гаспадаркі павінны зараз паставіць перад сабой задачу аграмадзіць сьвінагадоўлю, прыняць усе меры да паляпшэньня гэтай галіны жывёлагадоўлі. У раёнах прамыслова-экспартнае сьвінагадоўлі (Менска-Слуцкі і Аршанскі) трэба арганізаваць буйныя сьвінаводныя калгасы.

Ж—ч.

МЕНСК

Усе склады перадаць Саюзхлебу

Пастанова ўрадавай камісіі

Урадавая камісія па ліквідацыі хлебных заторaў на чыгунцы і па адшуканьні складаў для разьмяшчэньня хлеба прапанавала Белкаапсаюзу, Белрабсэкцыі і Белсельсаюзу перадаць Саюзхлебу ўсе склады, якія знаходзяцца ў гарадох, мястэчках, а таксама пры чыгуначных і прыстанскіх пунктах як ўласныя, так і арэндаваныя.

Разам з складамі перадаецца ўвесь абслугоўваючы пэрсанал, маемасьць і інвэнтар. Павінны быць перададаны склады, як занятыя хлебнымі грузамі, так і тыя, якія могуць быць скарыстаны для хаваньня хлеба, пры чым Саюзхлебу перадаецца і хлеб, які захоўваецца ў складах.

Камісія прапанавала Саюзхлебу зараз-жа прыступіць да прыёму складаў з тым, каб скончыць прыём ў тыдневы тэрмін. Каапэрацыйным арганізацыям прапанавана даць загад мясцом аб выкананьні пастановы камісіі.

Цэплафікацыя гор. Менску

Акрыканком зацьвердзіў праект цэплафікацыі гор. Менску. Эльвод ужо заключыў дагавор з арганізацыяй «Тепло и сила» на складаньне праекту і правядзеньне саміх работ.

У першую чаргу ў лінію цэплафікацыі будуць уключаны Дом Ураду, унівэрсытэцкі гарадок, Дом Селяніна, гасьцініца «Эўропа», новая бібліятэка, што будзе пабудавана, і рад іншых дамоў, якія маюць паравое або вадзянае ацяпленьне і знаходзяцца ў раёне ад Эльводу да унівэрсытэцкага гарадку.

Такім чынам, пара, якая раней на Эльводзе выпускалася ў паветра, зараз будзе скарыстана і дасьць вялікую эканомію апалу.

Адкрыўся беларускі радыё-унівэрсытэт

15-га кастрычніка адбылося ўрачыстае адкрыцьцё Беларускага рабоча-сялянскага унівэрсытэту. З прамовамі выступалі ад Наркамасьветы т. Некрашэвіч, ад ЦСПБ — т. Клімковіч, а таксама прадстаўнікі радыё-унівэрсытэту і радыё-цэнтру.

У радыё-унівэрсытэт залічана 120 слухачоў. Лік іх будзе даведзены да 200. Унівэрсытэт будзе перадаваць лекцыі 4 разы ў тыдзень.

Прыём на курсы ЦІП'а

Менская біржа працы адкрыла прыём заяў на курсы ЦІП'у. Вучні будуць прымацца ў будаўнічы цэх у якасьці муляроў і тынкаўшчыкоў.

Беспрацоўныя падаюць заявы ў сакцыі, да якіх яны прымацаваны; члены саюзаў, што зараз працуюць, падаюць заявы ў адпаведныя цэнтральныя праўленьні саюзаў. Вучням ЦІП'у будзе выдавацца стыпэндыя ў дадатак да дапамогі па беспрацоўі.

Апошні тэрмін падачы заяў—25 кастрычніка.

Курсы вылучэнцаў. Ва ўсіх акругах Беларусі арганізуюцца акруговыя трохмесячныя курсы вылучэнцаў, якія працуюць ва ўстановах.

Бязьдзейнасьць камісій па разьмеркаваньні начскладу запасу

Прадстаўнікамі каманднага кіраўніцтва РСЧА абсьледвана становішча начскладу запасу ў радзе мясцовасьцяй Беларусі. Выявілася поўная бязьдзейнасьць як цэнтральнай урадавай камісіі па разьмеркаваньні начскладу запасу пры СНК БССР, так і мясцовых камісій—у Гомелі, Бабруйску і Менску. Дапушчаны рад памылак у справе пасылкі начскладу на работу ва ўстановы. Начсклад накіроўваўся не на адпаведныя пасады, а ў «распараджэньне» адміністрацыі, якая назначала камандзіраў на пасады чорнарабочых, прыбральшчыкаў і г. д. Большасьць начскладу запасу, які працуе на прадпрыемствах, атрымлівае стаўкі ніжэй армейскіх. Ніякіх мер да перападрыхтоўкі начскладу для ўзьняцьця грамадзянскае кваліфікацыі—ня прымаецца.

****

„Зьвязда" дапамагла

ЗА ГРУБАСЬЦЬ—ВЫМОВА

Паводле заметкі «Асадзіць хулігана» зроблена рассьледваньне. Вартаўнік Белмясгандлю Астапенка адначасова працаваў і ў Белмясгандлі і Дзяржбанку. Па адміністрацыйнай лініі за грубасьць Астапенка атрымаў вымову, а ЦП саюзу дало яму адпаведнае ўказаньне.

ВЫМОВА ЗА ЎДЗЕЛ У ВЯЛІКОДНЫМ ВЕЧАРЫ

Селькораўская заметка «Антыінтэлігенты» рэдакцыяй пасылалася на рассьледваньне. У заметцы пісалася, што доктар, фэльчар і акушорка Сёмкава-Гарадзецкага сельсавету, Заслаўскага раёну (Меншчына) прымалі ўдзел у вечары на вялікдзень. Прэзыдыум Заслаўскага РВК абвесьціў гэтай «тройцы» вымову.

СПРАВА ПЕРАДАНА ПРАКУРАТУРЫ

Аршанская РСІ зрабіла рассьледваньне паводле заметкі «Безгаспадарчасьць у Аршанскай жылкаапэрацыі». Матар'ял аб безгаспадарчасьці пераданы пракурору, а аб паводзінах партыйцаў—у партыйныя органы. Узьнята пытаньне аб рэарганізацыі жылкаапэрацыі.

ГРЫНКЕВІЧ ПАКАРАНЫ

У кватэру рабочага Шыцікава па Мопраўскай вул. д. № 66 (Менск) уварваўся дамаўласьнік Грынкевіч і пачаў ламаць мэблю і вокны. Гэтым самым ён хацеў пазбавіцца ад Шыцікава. Факт хуліганства ўстаноўлены і нарсуд 2-га вучастку прыгаварыў Грынкевіча да трох месяцаў прымусовых прац.

СКЛАД СЕЛЬСАВЕТУ АЗДАРОЎЛЕНЫ

Члены Паўлавіцкага сельсавету, Круглянскага раёну (Аршанщчына) злоўжывалі, яны прысвойвалі грошы і г. д. Заметка «Растратчыкі на волі», якая пасылалася рэдакцыяй на рассьледваньне, пацьвердзілася.

Аршанская РСІ паведамляе, што старшыня сельсавету за нядбайныя адносіны да працы засуджаны на год пазбаўленьня волі. Таксама засуджаны і сакратар сельсавету. Зьняты з працы і выключаны з партыі загадчык хаты-чытальні, які скрыўляў клясавую лінію і нядбайна адносіўся да працы.

Крамную сетку—на бесьперапынку

Прэзыдыум ЦП саюзу саўгандальслужачых заслухаў інфармацыю Белбюро гандлёвай сэкцыі аб пераводзе работы гандлёвых устаноў на бесьперапынку.

Прэзыдыум ЦП адзначыў, што растлумачальная работа вакол пераходу на бесьперапынку праводзіцца ў невыстарчальнай меры.

МЦРК запрапанавана ў бліжэйшыя дні перавесьці на 5-піднёўку крамную сетку. У іншых гандлёвых установах і прадпрыемствах пытаньне аб пяціднёўцы павінна быць прапрацавана ў месячны тэрмін.

Культадзеду і белбюро даручана абгаварыць формы культработы пры бесьперапынцы і даць адпаведныя дырэктывы нізавым праф'яцэйкам і акруговым сэкцыям.

Пры ажыцьцяўленьні бесьперапынкі белбюро гандлёвай сэкцыі павінна мець пастаянны нагляд за тым, каб у крамах, якія пераходзяць на пяціднёўку, там, дзе гэта патрэбна, быў павялічаны штат. У кожнай установе і краме павінны быць устаноўлены расьпісаньні выхадных дзён.

Пастаўлена пытаньне аб пераводзе на пяціднёўку крам транспартнага спажывецкага таварыства, з падрыхтоўкай патрэбнай рабочай сілы.

Бюро сэкцыі даручана разам з праўленьнем ЦРК вывучыць пытаньне аб мэтазгоднасьці гандлю ў рэвалюцыйныя сьвяты. Гэта пытаньне павінна быць вырашана да 1-га лістапада.

За дзень

Новы старшыня галоўмастацтва. Старшынёю галоўмастацтва Наркамасьветы БССР замест тав. Жылуновіча назначаны т. А. Некрашэвіч. Тав. Некрашэвіч да апошняга часу працаваў у АПАД ЦК КП(б)Б.

У Менску будзе пабудаваны цырк. Калегія Наркамасьветы БССР выказалася за пабудову ў Менску дрэўлянага цырку на 3 тысячы асоб. Памяшканьне цырку будзе скарыстоўвацца таксама для правядзеньня масавых палітычных кампаній і тэатральных пастановак. Кошт будаўніцтва вызначаны ў 150 тысяч рублёў.

Антысэмітаў вон з саюзу. Прэзыдыум ЦП саюзу саўгандальслужачых зацьвердзіў пастанову агульнага сходу работнікаў групкому № 3 МЦРК аб выключэньні з саюзу за антысэмітызм працаўніка крамы ЦРК Хадасэвіча.

Здарэньні

За растраты. Загадчык буфэту МЦРК № 39 Андрэйчыкаў растраціў 400 рублёў. Андрэйчыкаў прыцягваецца да судовай адказнасьці.

Інспэктар акрэа Жыткоўскі Язэп растраціў больш 900 руб. Жыткоўскі аддаецца пад суд.

Падрабіў дакументы. Каб паступіць на 4-хмесячныя настаўніцкія курсы, гр-н Сташэўскі Ф. П. падрабіў дакументы аб маемасьці сваіх бацькоў. Сташэўскі прыцягваецца да адказнасьці.

Затрымана вядомая марфіністка Лазарава, якая падрабляла рацэпты для атрыманьня з аптэк морфію.

Упаўнаважаны райкома КП(б)Б і рэдакцыя газ. „Зьвязда"

— СКЛІКАЮЦЬ —

СЁНЬНЯ, 17 кастрычніка а 6 з пал. гадз. увеч.

НАРАДУ ячэйкавых упаўнаважаных „ЗЬВЯЗДЫ"

У ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Аб працы ўпаўнаважаных. 2. Аб спаборніцтве паміж ячэйкамі па падпісцы на «Зьвязду»

НАРАДА АДБУДЗЕЦЦА ў памяшканьні АПА райкому

Вуліца абавязкова 1 без спазьненьня

Шкодны лемантар для батракоў

ЦП саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых Беларусі намечана ліквідаваць у гэтым годзе няпісьменнасьць 50 тысяч батракоў. Аб гэтым ужо заключаны дагавор з НКАсьветы, вядзецца падрыхтоўчая работа. Зразумела, патрэбны лемантар, прыстасаваны для выхаваньня батрацтва.

Тут на дапамогу прышоў ЦК саюзу СГЛР СССР — прыслаў лемантар, які складзены спэцыяльна для сельгасрабочых.

Чаго-ж лепш — перавесьці на беларускую мову і лемантар гатоў.

Узяліся за справу.

Але праз некалькі дзён прэзыдыум ЦП саюзу вынес пастанову, што лемантар гэты зусім ня годны, бо ў ім змазаны клясавы характар выхаваньня батрацтва, няма нічога аб індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі вёскі, сацыялістычным спаборніцтве. Дана зусім няправільная ўстаноўка аб УсеКП(б), аб узаемаадносінах рабочае клясы з сялянствам. Не даволі паказаны кулак, як клясавы вораг і г. д.

На старонцы 12 ёсьць артыкульчык «Работа у Нила», прывядзем яго цалкам.

«У Нила Мишина и по дому и на поле работа шла по найму (падкрэсьлена намі).

Наша Ариша и Нина и шурин мой Мирон работали у Нила Мишина.

Арина и Нина работали по найму и на поле.

Дома они и шили, и мыли, и доили. На поле они пололи.

Мирон боронил и полол».

Як бачыце, поўная ідылія, у той час, як сапраўды перад намі моцная кулацкая гаспадарка, дзе і дома, і на полі работа ідзе па найме, дзе 3 батракі эксплёатуюцца на ўсе 100 проц. Але аб гэтым ні слова. Тое-ж самае і ў арт. «Потап і Пахом» (стар. 13).

Далей, на стар. 39 арт. «Как работают совхозы». Чаму вучыць гэты артыкул?

«Не все совхозы хороши. Однако, число хороших совхозов все растет. ...Эти совхозы дают хорошие доходы. Они служат для увеличения народных средств. Они повышают доходность крестьянских хозяйств (?)... ...Сортовыми семенами и племенным скотом они снабжают население» і т. д

Вось як малююць батраку ролю і значэньне саўгасаў—нашых, сацыялістычных ячэек у вёсцы.

На ст. 68 ёсьць арт. «Совхоз колхозу старший брат». Падамо вытрымкі з гэтага артыкулу.

«В новый совхоз «Советский Ключ» об'единилась сплошная голытьба (?) (падкрэсьлена намі)... Деревенские мужики из богатеньких (?) (падкр. намі) нет-нет да и подковырнут колхозников».

Мы пытаемся—што гэта за «голытьба» і што гэта за «богатенькие»?

Ст. 71 арт. аб КСУ—«В случае несчастья комитет помогает крестьянам(?) выбраться из беды».

Бачыце, калі не «голытьба» і «богатенькие», дык «крестьяне». Паогул слова «крестьяне» заваявала сабе права грамадзянства ў лемантары. Так, на стар. 73 чытаем:

«Каждый крестьянин (?) (падкр. намі) через своих представителей участвует в управлении государством. Наши сельсоветы и волсоветы в большинстве состоят из крестьян»—і вельмі асьцярожна—«в советы иной раз пролезают богатеи»(?) (падкр. намі). Зноў такі назваць кулака не адважыліся.

На ст. 75 ёсьць арт. «Наша партия ВКП(б)».

Аказваецца, што УсеКП(б) аб'яднае ў сваіх радох «всех преданых пролетариату товарищей» (?) (падкр. намі).

Што гэта такое? Чыя гэта фармулёўка? З якога статуту гэта ўзята? Думаем, ва ўсякім разе, ня з статуту УсеКП(б).

У гэтым-жа артыкуле чытаем «у ВКП(б) главная работа—поправить хозяйство, чтобы рабочему и трудящемуся крестьянину лучше жилось. Поэтому строятся новые фабрики и заводы и ведется упорная борьба за снижение цен на товары».

Каракеі, ЦК саюзу СГЛР СССР плянецца ў хвасьце самай адсталай масы саюзу. Зьніжэньне цэн на тавары, вось што зразумее няпісьменны батрак, вось аб чым яму трэба пісаць, а індустрыялізацыя, калектывізацыя—аб гэтым мы яму напішам тады, калі ён ліквідуе няпісьменнасьць.

Цяпер нам ясна, чаму прэзыдыум ЦП саюзу СГЛР Беларусі вынес такую жорсткую пастанову. Чаму ён адмовіўся скарыстаць гэты лемантар.

Паўстае пытаньне, можа гэта стары які небудзь лемантар, выданы некалькі год таму назад?

Дык не. На 1-й стар. мы бачым:

«Букварь для сельхозделегатов составили А. А. Захарьев и сотрудник Культотдела ЦК профсоюза СХЛР СССР, под редакцией И. И. Ахматова и Г. А. Шмидта. Издание четвертое, исправленное. Допущено научно-политической секцией государственного ученого совета. ГИЗ 1929 г.—тираж 250.000».

Як бачыце, 250.000 гэтага лемантару разыйшлося па СССР. Можа ЦК саюзу СГЛР СССР падлічыць, колькі падручнікаў трэба будзе выдаць, каб прафільтраваць мазгі батракоў пасьля такога, з дазволу кажучы, выхаваньня?

Е. В

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Вялікая антырэлігійная дэманстрацыя

МАГІЛЕЎ. (Наш. кар.). 13-га кастрычніка, у дзень яўрэйскага рэлігійнага сьвята ў горадзе адбылася вялікая антырэлігійная дэманстрацыя рабочых. У дэманстрацыі ўдзельнічала больш 15 тысяч чалавек.

Выступаўшыя прамоўцы патрабавалі рашучага наступленьня на рэлігію, якая перашкаджае нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву. У вынесенай рэзалюцыі дэманстранты заявілі, што яны ўсе зьявяцца на працу ў дні рэлігійных сьвят і патрабавалі перадачы малітвенных дамоў пад культурныя ўстановы.

Мітынг падтрымаў хадайніцтва рабочых швэйнай фабрыкі аб перадачы ім сынагогі пад клюб і вылучыў дэлегацыю, якая перадала гарсавету пастанову мітынгу.

Раённая с.-г. выстаўка

БАРЫСАЎ. (Наш. кар.). Адкрылася раённая сельска-гаспадарчая выстаўка, на якой прадстаўлены экспанаты сельскае гаспадаркі, саматужнай вытворчасьці і г. д. 85 проц. экспанатаў даставілі калгасы і камуны. Выстаўку наведала вялікая колькасьць сялян і рабочых.

Экспанаты сацыялістычнага сэктару паказваюць вялікія дасягненьні камун і калгасаў па ўздыме ўраджайнасьці. Першую прэмію на выстаўцы атрымала камуна «Інтэрнацыянал». Усяго раздана прэмій на 700 руб.

Пабудавана новая чыгунка Магілеў—Асіповічы

Урачыстае адкрыцьцё чыгункі—у дні Кастрычнікавага сьвята

Заканчваецца пабудова новай чыгуначнай лініі Магілеў-Асіповічы, намечанай пяцігадовым плянам разьвіцьця транспарту.

З 4-га кастрычніка на працягу 107 кілёмэтраў ад Магілева да станцыі Жукаўка ўжо кожны дзень ходзяць два цягнікі. Лінія будзе скончана да Кастрычнікавага сьвята, калі адкрыецца нармальны пасажырскі і таварны рух.

Пабудова лініі мае вялізарнае эканамічнае значэньне для раду раёнаў, якія раней ня былі зьвязаны з чыгункай.

Новы курорт у БССР

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Зараз заканчваецца пабудова санаторыя «Барнаўшчына» для хворых на рэўматызм, на параліч нэрвовай сыстэмы і г. д. Санаторы знаходзіцца на беразе прыгожага возера ў хваёвым лесе. Галоўны корпус санаторыя ўмяшчае 28 хворых. Курорт мае крыніцы з жалезістымі і серкавымі водамі, якія па сваёй якасьці не ўступаюць мінэральным водам Каўказу.

Мэліярацыйныя работы на Полаччыне

АСЬВЕЯ. (Наш кар.). Скончаны мэліярацыйныя работы ў раёне Асьвейскага возера. Нядаўна адбылося ўрачыстае адкрыцьцё каналу, па якім ідзе вада з возера. Канал пракапаны на працягу 17 кілёмэтраў. Мэліярацыя дала магчымасьць асушыць 8.000 гэкт. зямлі. На асушанай зямлі арганізуецца некалькі буйных калгасаў. На мітынг, прысьвечаным адкрыцьцю каналу, прысутнічала звыш 2.000 сялян.

Замах на старшыню сельсавету

МАГІЛЕЎ. (Наш. кар.). Невядомыя злачынцы зрабілі замах на старшыню Гайшчынскага сельсавету, Прапойскага раёну Васількова. Яны выстралілі ў вакно хаты, але куля прайшла міма. Злачынцы ня супакоіліся на гэтым і ўвечары падпалілі гумно Васількова са збожжам.

Васількоў праводзіў правільную лінію партыі і арганізоўваў у раёне калгас.

Па справе затрыманы 3 падкулачнікі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Ад ЦКК КП(б)Б.

У панядзелак, 21 кастрычніка, а 6 з палов. увечары адбудзецца насяджэньне парткомітэту ЦКК КП(б)Б (Менск, Савецкая, 55, 3-ці паверх, пакой № 18), дзе будуць разглядацца справы наступных таварышоў з Менскай партарганізацыі:

Харчэнкі Івана Сьцяпанавіча, Магідзіна Фавдзея Аронавіча, Гарнавесава Тодара Васільевіча, Кліменкава Івана Карпавіча.

Паказаныя таварышы павінны зьявіцца на вызначаны час. Праезд за свой кошт.

Сакратар ПК ЦКК КП(Б) ЛЯЎКОЎ.

—Дом Камасьветы імя Карла Маркса. Сёньня, а 6 гадз. 30 хв. увеч., адбудзецца даклад-кансультацыя т. Рыўліна аб міжнародным становішчы СССР. Пасьля дакладу—культурфільм. Увыход на партыйных і камсамольскіх білетах і па білетах, выданых домам камасьветы.

— У суботу, 19 кастрычніка, а 8-й гадзіне ўвечары адбудзецца вечар актыву вытворчых ячэек. Даклад т. Страноўскага аб ходзе сацыябаронніцтва ў прамысловасьці БССР. Пасьля дакладу—канцэртнае аддзяленьне.

Ячэйкі, якія не атрымалі білетаў, павінны зьявіцца ў дом камасьветы ад 11 да 3 гадз. дня і ад 6 да 9 гадзін увечары.

— У чацьвер, 17 кастрычніка, а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні РК КП(б)Б склікаецца пашырэны пленум райшэфпраўленьня Фрунзаўскага раёну разам за ўсімі культадзеламі ЦП прафэсіянальных саюзаў.

Парадак дня: Справаздачны даклад праўленьня і чарговыя задачы. Даклады ЦП прафсаюзаў сельгаспрабочых, хэмікаў, нархарч, асьветнікаў аб іх працы на вёсцы.

— БДУ. Сёньня, 17 кастрычніка роўна а 8 з палав. гадз. увечары ў актавай залі БДУ, адбудзецца агульны сход студэнцтва праўгасу а парадкам дня: 1) Задачы чыстки партыі і ўдзел у чыстцы студэнцтва. (Даклад т. Гохмана).

Прысутнасьць студэнтаў абавязкова.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня, а 8 гадз. адбудзецца арганізацыйны сход усіх гурткоў і куроў пры Доме Асьветы. Яўка ўсіх запісаўшыхся абавязкова. Пасьля сходу—кіно.

— КЛЮБ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ. З 15 кастрычніка пачаліся заняткі ў гурткох па вывучэньні замежных моў. Марксыцка-ленінскі гурток, пачынае сваю працу 20 кастрычніка.

— У чацьвер, 17 кастрычніка, а 7 гадз. увечары ў залі пасяджэньняў акруткому адбудзецца інструкцыйная нарада кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў гор. Менску.

Запрашаюцца наступныя т. т.: Грасўская (НКЗ), Фрыдляндз, Дзямідовіч (працасьветы), Сучкова («Чырвоная Зьмена»), Эпштэйн («Рабочы»), Капцэльсон (ЦРД), Беленькая (цукерня ф-ка), Турбовіч, Браварнік (ЦК КП(б)Б), Байдаліна (АКРФА), Папова (Рабіс), Вайнштэйн (Гандальбуд), Макарэвіч (інсп. мясцовай прамысловасьці), Майсейчык (Украінлес), Улезла, Гулэйда, Лукашэвіч (ЦВК), Палякоў (Белпайгандаль), Каплан (хлебазавод), Цёмкін (чыгунка), Іофэ (шчотачная ф-ка), Капылёва (Сампрамсаюз), Палольскі (абутковая ф-ка), Краўчанка, Кардашэнка (НКФ), Гофман (НКЮ), Белько («Пралетары»), Нарко (хэмфармазавод), Багарад (Белкаапсаюз), Васкабойнікаў (Камунбанк).

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ АКТЫЎ МОПР'у.

СЁНЬНЯ, 17 кастрычніка, а 7-й гадз. увечары, у памяшк. КЛЮБУ ХАРЧАВІКОЎ (Школьная, 1) Менскім АК МОПР склікаецца

агульна-гарадзкі сход МОПР-актыву гор. Менску.

Парадак дня: 1) Аб бліжэйшых задачах МОПР-арганізацыі; 2) Аб курсах МОПР-актыву.

Яўка членаў і кандыдатаў бюро ячэек і рэўкамісій—абавязкова.

Мен. АК МОПР'у.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

ПРЭМ'ЕРА

Чацьвер, 17 кастрычніка спэктакль для саюзу мэдсанпрацы. Білеты ў саюзе

Пятніца, 18 кастрычніка спэктакль для 26 савецкай школы. Білеты ў школе і ў касе тэатру

Д. Бергельсон **ГЛУХІ**

Пачатак спэктакляў роўна а 7 з пал. гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — Мастацкі фільм **СТАРОЕ І НОВАЕ** — ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — КІНО-ХРОНІКА САУКІНО № 43 і інфармацыя Белдзяржкіно ТРАМВАЙ ПАШОЎ

КІНО Інтэрнацыянал — Амэрыканскі фільм **НАНУК** у 6-ці частках. Звыш праграмы: хроніка Саўкіно № 49. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО Пралетары — Новы амэрыканскі фільм **СТАРАЯ № 99** арыгінальная камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка Саўкіно № 53. Пачатак сэансаў а 7 з пал. г. Каса—ад 6 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Адна з лепшых карцін сусьветнай кінематаграфіі **ЧАНГ** (Жахі джунгляў) у 6 частках. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і сэрадах ад 12 гадз. дня.

КІНО Спартак — Ад аўторка 15 кастрычніка выдатны фільм **Цяжкія гады** драма ў 9 частках. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г. 30 м

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2 гадзіны дня

АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО ВСЕСОЮЗНОЕ ЗАГОТОВИТЕЛЬНОЕ ОБ'ЕДИНЕНИЕ КОММУНАЛЬНЫХ ХОЗЯЙСТВ

„ВЗОК" МОСКВА

Протизопожарные, водопроводно-канализационные, санитарно-технические материалы, автотранспорт, оборудование по механизации коммунального строительства, спец. и прозодежда для пожарных.

ОТКРЫТО ВСЕБЕЛОРУССКОЕ ПРЕДСТАВИТЕЛЬСТВО СО СКЛАДОМ гор. Минск, Советская ул. 97, тел. 15-70.

Да ведама рабочых і работніц працуючых у некалькі зьмен.

З 17 па 25 кастрычніка адбываецца **ПРЫЁМ ЗАЯЎ** у нова-адчыненую пазьменную Беларускую Рабочую **ШКОЛУ ЎЗВЫШАНАГА ТЫПУ.**

Заявы прымаюцца з 10 да 2 г. у канцылярыі Акр. інспэкцыі Народнае Асьветы (Пляц Волі АВК, 3-ці паверх) і з 7 да 9 у канцылярыі школы (32-ая сямігодка, Загарадная вуліца)

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй ня нізэй 4 груп сямігодні. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.

Плата за куро 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў пачатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзеяцікапеечныя марці.

Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усекабанк, бяг. рахунак № 683. Усю карэспандэнцыю накіроўваць: Менск